Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Субота 16 красавіка 1938 г. № 21 (363). Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Владзімір Маякоўскі

Споўнілася восем год з дня смерці Владзіміра Маякоўскага, «лепшага, таленавіцейшага паэта нашай совецкай эпохі» (Сталін).

Стрэл, што з'явіўся вынікам нечуванай сістэматычнай траўлі, якую вялі супроць вялікага паэта рэволюцыі трацкісцка-бухарынскія мярзаўцы з РАПП і іншыя кулацкія падонкі ў літаратуры, абарваў прыгожае жыццё Владзіміра Маякоўскага.

Владзімір Маякоўскі на працягу многіх год вёў непрымірымую барацьбу супроць буржуазіі і памешчыкаў, ён увесь свой выдатны талент аддаў да астатняга радка пролетарыяту.

Яшчэ ў юнацкія годы Маякоўскі звязаў свой лёс з барацьбой большэвіцкай партыі. З таго часу ён нясцынна праследваў буржуа і яго мяшчанска-канарэечных літаратурных прадстаўнікоў, граміў іх і біў знішчальным агнём сатыры, «кавалерией острот».

Владзімір Маякоўскі зразумеў патрэбы рэволюцыйнай масы ў новым, вогненым, блізкім і родным ёй слове і даў гэтае слова. Ён прадвяшчаў і клікаў рэволюцыю:

В терновом венце революций
грядет шестнадцатый год.

Паэт памыліўся ўсяго на адзін год.

Магутным голасам супроць крывавай ваеннай бойні ў часе шавіністычнага выцця пэўнай часткі інтэлігенцыі быў голас Маякоўскага ў яго паэме «Вайна і мір». З першых дзён Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Маякоўскі становіцца радавым яе змагаром, «чернорабочим революции». Ён працуе ў «Роста», малюючы плакаты, пішучы агітацыйныя вершы. Ён у сваіх «загадах па арміі мастацтваў» заклікае мастакоў служыць рэволюцыі.

Маякоўскі піша сваю «Містэрыю буф», у якой у першы год пасля Кастрычніцкай рэволюцыі імкнецца асэнсаваць велічнасць адбываючыхся падзей.

Маякоўскі ніколі не быў бясстрасным фіксатарам падзей. Яго «звонкая сила» была ўсім пафасам і страсцю накіравана на абарону інтарэсаў «атакующего класса», яго паэзія была глыбока партыйнай, большэвіцкай.

Творы Маякоўскага сталі класічнымі творамі совецкай паэзіі.

У «Вершах аб совецкім пашпарце» ён выразіў пачуццё патрыятызма, якім гарыць сэрца кожнага грамадзяніна совецкай эпохі:

Читайте,
завидуйте,
я — гражданин
Советского Союза

Патрыятызм Маякоўскага, пачуццё гордасці за сваю радзіму, нянавісць да ворагаў радзімы былі лейтматывам яго творчасці. Гэтую партыйную, большэвіцкую страснасць, палымнеючую любоў да сваёй радзімы і нянавісць да яе ворагаў Маякоўскі пранёс праз усё сваё вялікае жыццё.

Маякоўскі ў сваіх творах выразіў пачуцці любві нашага народа да сваіх правадыроў. Ён з патрасаючай сілай нарысаваў вобраз Ільіча ў сваёй паэме «Владзімір Ільіч Ленін», ён не раз звяртаўся да вобраза таварыша Сталіна і лічыў за вышэйшую ацэнку каштоўнасці вершаў, каб пра іх гаварыў таварыш Сталін, ён вучыў нашу моладзь браць прыклад з тав. Дзержынскага.

І ў гэтым мы бачым Маякоўскага, як вернага патрыёта сваёй радзімы.

Маякоўскі адточваў зброю большэвіцкай самакрытыкі. Ён выкрываў бюракратаў, чыноўнікаў, авантурыстаў. Яго верш «Празасядаўшыяся» заслужыў пахвалу Владзіміра Ільіча.

Адкуль чэрпаў вялікі паэт натхненне для сваіх твораў?

Гэтае натхненне ён чэрпаў з жыцця. Сіла Маякоўскага была ў непарыўнай сувязі з масамі, з народам. У сваіх творах ён выражае думкі народа, яго велізарны аптымізм, яго нястомную энергію.

Нашым паэтам ёсць чаму вучыцца ў Маякоўскага. Яго багатая літаратурная спадчына з'яўляецца для іх цудоўным узорам палітычнай завостранасці, мабілізацыйнай гатоўнасці паэзіі, яе актыўнага служэння рэволюцыі.

Маякоўскі для нашых паэтаў з'яўляецца прыкладам таго, што для вялікага паэта няма задужа малых тэм. Кожная тэма пад пяром Маякоўскага ператваралася ў тэму паэтычную і глыбока хвалюючую. І гэтак было заўсёды, пра што-б ні пісаў паэт. Ці ён агітуе за совецкія тавары, ці бічуе рвача і прагульшчыка, ці выкрывае новую кулацкую тактыку, ці, нарэшце, узнімаецца да пафасных вышынь, як у вершы «Левы марш», або спрабуе намаляваць шляхі Кастрычніцкай рэволюцыі, ці нарысаваць геніяльны вобраз Ільіча, — усюды відаць сапраўды арліныя гарызонты і арліны кругагляд Маякоўскага. Маякоўскі вучыць нашых паэтаў укладваць у паэтычны твор усю страсць сваёй душы, «крывёю свайго сэрца» пісаць кожны радок, у кожны аб'ект сваёй паэзіі ўкладваць сваю асабістую, зацікаўленасць, увесь свой пафас. Калі Маякоўскі пісаў:

Я с небес поэзии
бросаюсь в коммунизм,
потому что
нет мне
без него любви, —

дык гэта азначала, што Маякоўскі ўсёй сваёй істотай змагаецца за комунізм, бо комунізм дае шчасце народу і яму асабіста.

Маякоўскі вучыць нашых паэтаў гістарычнаму кругагляду, правільнаму разуменню рэчаіснасці.

Фальшывай патэтыцы, сантыментальнай псеўданароднай алілуйшчыне Маякоўскі супроцьстаўляе суровасць рэволюцыйнага байца і напамінае пра тую кроў, якая была праліта за рэволюцыю нашымі бацькамі і братамі, напамінае пра дні голаду і холаду, якія перажыла наша краіна, каб, ведаючы гэта сваё мінулае, народ яшчэ мацней мог любіць шчаслівае сёння.

Вось чаму Маякоўскі пісаў:

Землю,
где воздух
как сладкий морс,
бросишь
и мчишь колеся,—
но землю,
с которою
вместе мерз,
вовек
разлюбить нельзя.

Таварыш Сталін вучыць нас так разумець нашы перамогі: «Прыемна і радасна знаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма».

Сапраўды неацанімай заслугай Маякоўскага перад соцыялістычнай культурай з'яўляецца ўпартая наватарская работа паэта, яго пошукі новых форм. Пагарджаючы эпігонствам . абыякавасцю да майстэрства і тэхнікі верша, якое было характэрна для некаторых совецкіх паэтаў, Маякоўскі нясцынна ірваўся «в завтра, вперед», шукаў і эксперыментыраваў, знаходзіў новыя рытмы, новыя словы, новыя вобразы.

Маякоўскі заклікаў совецкіх паэтаў бязлітасна біць і граміць ворагаў, усю гэту трацкісцка-бухарынскую погань, зацкаваны якой і загінуў сам Маякоўскі.

З якой актуальнасцю гучаць і цяпер словы Маякоўскага:

Товарищ,
помни—
между нами
орудует
классовый враг.

Маякоўскі бачыў новую тактыку ворага і ўмеў яе паказаць чытачу. Як трапна ён намаляваў партрэт кулака ў новым абліччы, кулака, які дзейнічае «ціхай сапай».

Нястомная пільнасць з'яўляецца свяшчэнным абавязкам кожнага грамадзяніна нашай радзімы. Канчатковы разгром і выкарчаванне трацкісцка-бухарынскай банды, якая затравіла Маякоўскага, а потым забіла Горкага, будзе лепшым ушанаваннем вялікіх дзеячоў літаратуры—Горкага і Маякоўскага. Лепшым помнікам вялікаму паэту рэволюцыі з'яўляецца «построенный в боях социализм».

Імя Владзіміра Маякоўскага будзе яркай зоркай ззяць у сузор'і вялікіх імён стваральнікаў соцыялістычнай культуры, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна.



В. В. МАЯКОЎСКІ.

В. Маякоўскі

НЕЗВЫЧАЙНАЯ ПРЫГОДА, ШТО АДБЫЛАСЯ З ВЛАДЗІМІРАМ МАЯКОЎСКІМ НА ДАЧЫ

(ПУШКІНА, АКУЛАВА ГАРА, ДАЧА РУМЯНЦЭВА, 27 ВЕРСТ ПА ЯРАСЛАЎСКАЙ ЧЫГУНЦЫ).

У сотні сонц заход палаў,
у ліпень перла лета,
гарачыня,
як вар,
плыла —
было на дачы гэта.
Прыгорак Пушкіна гарбіў
Акулавай гарою,
а ніз прыгорка —
вёскай быў,
крывіўся стрэх карою.
А там, за вёскаю, —
дзіра
была, напэўна, у доле,
і ў дзірку сонца кожны раз
спускалася паволі.
А заўтра
свет заліты зноў
барвоваю навалай.
Мне гэта ўсё ўзбурыла кроў,
страшэнна раззлавала.
І так абурыўся я раз,
што ўсё ад страху зблекла;
я ў вочы сонцу крыкнуў:
«Злазь!
Пакінь цягацца ў пекла!»
Я крыкнуў сонцу:
«Дармаед!
Пястун ты хмарнай ваты!
А тут—не знай ні зім, ні лет,
сядзі, малюй плакаты!»
Я крыкнуў сонцу:
«Пачакай,
гультай золаталобы!
Чым так заходзіць,
лепш на чай
ты да мяне
зайшло-бы!»
Ах, я-ж загінуў!
Назнарок
ка мне,
па добрай волі,
само,
распяўшы промень-крок,
ідзе яно па полі.
Стаіўшы страх,
я стаў хутчэй
рэтыравацца задам.
У садзе зірк яго вачэй.
Яно ўжо крочыць садам.
Праз дзверы,
шчыліны,
вакно
наперла сонца маса
і, ледзь адсопшыся,
яно
загаварыла басам:
«Ганю не ў той бок я агні
раз першы ад стварэння.
Мяне ты клікаў?
Чай гані,
гані, паэт, варэнне!»
Сляза з вачэй,—
гарыць мой твар,
такая спёкі сіла,—
ды я яму —
на самавар:
«Ну, што-ж,
сядай, свяціла!»
І чорт-жа глотцы даў маёй
крычаць яму дакоры!
Сяджу на лаве,
сам не свой,
дрыжу—не выйшла-б горай!
Аднак,
да сонечных яснот
прывык я
паступова, —
за словам слова мы —
і от
зайшла ў нас размова.
Я тое,
гэта гавару,
кажу—заела Роста,
а сонца:
«Ладна,
не гаруй,
глядзі на рэчы проста!
А мне свяціць лягчэй?
Ну, дзе-ж!
Паспробуй, даражэнькі!
А падручылася —
ідзеш
і свеціш ва ўсе зрэнкі!»
Размова ў нас—
да цемнаты,
да быўшай, значыць, ночы.
Якая-ж цемра?
Мы—на «ты», —
гляджу я смела ў вочы.
Мацнее дружба ўсё мая, —
б'ю па плячу яго я.
А сонца зноў-жа:
«Ты ды я.
Нас, таварыш, двое!
У свету шэрае хлам'ё
з арлінага палёту
Я, сонца, буду ліць сваё,
а вершамі — сваё ты».
Турма начэй
і ценю мгла
пад сонц двухстволкай пала.
Гармідар вершаў і святла —
смалі у што папала!
Яно змарнее, —
хоча ноч
прыйсці,
тупая сонніца.
Тут — я
на ўсю заззяю моц —
і зноўку дзень зазвоніцца.
Свяціць заўсёды,
ўсюды,
скрозь,
без краю і бясконца,
свяціць да дзён астатніх! —
Вось
лозунг мой—і сонца!

Пераклаў К. КРАПІВА.

На вечары памяці В. В. Маякоўскага

14 красавіка ў Доме пісьменніка БССР адбыўся вечар, прысвечаны восьмай галавіне з дня смерці паэта рэволюцыі В. В. Маякоўскага.

З дакладам аб літаратурнай спадчыне паэта выступіў дырэктар Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР тав. **Красноўскі.**

Указаўшы на раннюю сувязь В. В. Маякоўскага з партыяй большэвікоў, дакладчык падкрэсліў, што толькі гэтая сувязь дапамагла паэту затым сфарміраваць свой рэволюцыйны светапогляд.

Спрыяючы ўплыў на паэта аказала таксама сувязь з вялікім Горкім. Таму Маякоўскі аказаўся дастаткова падрыхтаваным, каб на другі-ж дзень рэволюцыі закрочыць з ёй у ногу.

Указаўшы на тое, што ўсе творы Маякоўскага вызначаюцца шчырасцю, рэволюцыйнай страснасцю, велізарнай любоўю да соцыялістычнай радзімы, да комуністычнай партыі і яе правадыроў, дакладчык заклікаў пісьменнікаў і паэтаў БССР быць такімі-ж страснымі, любячымі грамадзянамі СССР і ўсю сваю энергію, усе свае здольнасці аддаць да канца справе комунізма.

Тав. М. Лынькоў у сваім выступленні адзначыў, што беларускія і яўрэйскія паэты любяць Маякоўскага і за апошні час правялі вялікую работу па перакладу твораў Маякоўскага на беларускую і яўрэйскую мовы.

Як-бы ў пацвярджэнне яго слоў, паэты **Крапіва, Шведзік, Куляшоў, Хведаровіч, Якімовіч, Глебка** прачыталі вершы Маякоўскага ў перакладзе на беларускую і яўрэйскую мовы. Яўрэйскі паэт тав. **Мальцінскі** прачытаў вершы, прысвечаныя Маякоўскаму. З чыткай вершаў Маякоўскага выступілі тав. **Шапавалаў** і прысутнічаўшы на вечары лётчык грамадзянскай авіяцыі тав. **Шварц.**

Як паведаміў на вечары тав. М. Лынькоў, вечары памяці Маякоўскага з удзелам пісьменнікаў і паэтаў БССР арганізуюцца на прадпрыемствах, у школах, у навучальных установах.

ДЭКАДА АЗЕРБАЙДЖАНСКАГА МАСТАЦТВА

ВЯЛІКІ ПОСПЕХ

На спектаклях прысутнічалі таварышы І. В. СТАЛІН, В. М. МОЛАТАЎ, Л. М. КАГАНОВІЧ, К. Е. ВАРАШЫЛАЎ, А. І. МІКАЯН, М. Д. БАГІРАЎ

З вялікім поспехам праходзіць у Маскве дэкада азербайджанскага мастацтва. Гледачы сталіцы надзвычай горача прымаюць спектаклі.

8 красавіка ў другі раз была паказана Азербайджанскім Дзяржаўным тэатрам оперы і балета імя М. Ф. Ахундава опера народнага артыста РСФСР, АзССР і УзССР Р. М. Гліэра «Шах-Сенем».

9 красавіка Тэатр оперы і балета імя М. Ф. Ахундава паказаў спектакль «Аршын мал алан», пастаўлены галоўным рэжысёрам засл. арт. АзССР Ісмаілам Ідаят-Задэ. Гэта папулярная музыкальная камедыя, напісаная кампазітарам Узеірам Гаджыбекавым яшчэ ў 1914 годзе, знаёміць гледача з раннім перыядам яго творчасці.

Да рэволюцыі гэта камедыя хвалявала гледачоў не толькі як яркі твор мастацтва, але і як смелы пратэст супроць бытавога заняволення жанчын. А так як бяспраўе жанчыны было ўзаконена ісламам, дык камедыя Гаджыбекава давала тым самым бой і рэлігіі. Зараз камедыя хоць і не мае ранейшай памфлетнай вайстрыні і злабадзённасці, але не страціла свайго мастацкага значэння, захапляе жыццёрадасным гумарам, весялосцю.

Заслужаныя артысты АзССР Бюль-Бюль і Г. А. Гаджыбабабекаў, артысткі Сона Мустафаева, Аля Тэрэгулава, Мар'ям Бабаева, Агігат Рзаева цікава выконвалі свае ролі, жыва правялі спектакль. Добра гучаў аркестр народных інструментаў пад кіраваннем дырыжора Сеіда Рустамава. Меладычная, сапраўды народная музыка, арганічна зліваючыся з дзеяннем на сцэне, падкрэслівала нацыянальны каларыт спектакля.

На спектаклі прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, М. Д. Багіраў. Па заканчэнні спектакля ўсе гледачы наладзілі выканаўцам гарачую авацыю.

Увечары 10 красавіка Азербайджанскі Дзяржаўны тэатр оперы і балета імя М. Ф. Ахундава ў другі раз паказаў музыкальную камедыю Узеіра Гаджыбекава «Аршын мал алан». Як і напярэдадні, спектакль прайшоў з вялікім поспехам.

11 красавіка была паказана опера кампазітара Мусліма Магамаева «Наргіз»—першая азербайджанская опера на совецкую тэму. Опера «Наргіз» разгарнула перад гледачом адзін з эпізодаў барацьбы азербайджанскага народа ў 1920 годзе супроць крывавага панавання мусаватыстаў, якія імкнуліся ператварыць краіну ў калонію заможнага капіталізма. Герой оперы—вольналюбівы і мужны азербайджанскі народ. Дзея адбываецца ў 1920 годзе, напярэдадні ўстанаўлення совецкай улады ва ўсім Азербайджане. На прыкладзе падзей у адной вёсцы опера паказвае барацьбу народа супроць мусаватыстаў, здраднікаў радзімы, наёмнікаў імперыялізма. У оперы супроцьстаўляюцца дзве сілы, якія вядуць барацьбу,—народ і контррэволюцыя. З аднаго боку—вясковы «уладар», дэспат Агалар-бек, з другога—сяляне, якіх вядзе за сабой бакінскі рабочы-большэвік. Фінал оперы—разгром контррэволюцыйнай зграі.

«Наргіз»—гераічная музыкальная драма аб памятных днях барацьбы за Совецкі Азербайджан, прысвечана аўтарам, нядаўна памёршым кампазітарам Муслімам Магамаевым, 15-годдзю Азербайджанскай рэспублікі (споўнілася ў 1935 годзе).

Створаная кампазітарам Магамаевым опера поўна арыгінальных гучных мелодый, народнай музыкі і песень.

Аркестр пад кіраваннем маладога дырыжора Ніязі выдатна справіўся са сваёй задачай. Як і ў папярэдніх оперных спектаклях, вялікае ўражанне пакінулі масавыя сцэны і танцы.

У ліку выканаўцаў галоўных роляй у спектаклі ўдзельнічалі народная артыстка АзССР Шаўкет Мамедава, заслуж. артысты АзССР Г. А. Гаджыбабабекаў і М. Т. Багіраў, артысты Якуб Рызаеў, Аждар Султанаў і інш. Асабліва поспех мела народная артыстка АзССР Шаўкет Мамедава, якая стварыла яркі вобраз мужнай і смелай дзяўчыны, актыўнай удзельніцы гераічнай барацьбы за вызваленне азербайджанскага народа.

Спектакль прайшоў з вялікім поспехам. Шмат разоў у зале раздаваліся бурныя апладысменты.

На спектаклі прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, А. І. Мікаян, М. Д. Багіраў.

Пасля скончэння оперы гледачы горача віталі ўдзельнікаў спектакля шумнай авацыяй.

Опера «Наргіз»—вялікая перамога не толькі азербайджанскага, але і ўсяго совецкага опернага мастацтва.

* * *

13 красавіка ў Вялікім тэатры ў трэці раз была паказана опера кампазітара Р. М. Гліэра «Шах-Сенем». Асноўныя ролі выконвалі: народная артыстка АзССР Шаўкет Мамедава, заслужаны артыст АзССР М. Т. Багіраў, артыст Якуб Рызаеў.

На спектаклі прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, А. А. Андрэеў, А. І. Угараў, М. Д. Багіраў.

На заключным спектаклі тэатра імя М. Ф. АХУНДАВА прысутнічалі таварышы І. В. СТАЛІН, В. М. МОЛАТАЎ, К. Е. ВАРАШЫЛАЎ, В. Я. ЧУБАР, А. І. МІКАЯН, Н. І. ЕЖОЎ, М. Д. БАГІРАЎ

Опера народнага артыста АзССР Узеіра Гаджыбекава «Кёр-Оглы», якой адкрылася дэкада азербайджанскага мастацтва ў Маскве, была паказана 14 красавіка ў трэці раз. Гэта быў заключны спектакль Азербайджанскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава. Ён ішоў на сцэне Дзяржаўнага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра СССР.

Кампазітарскае майстэрства Узеіра Гаджыбекава зноў сустрэла гарачы прыём. Як толькі аркестр пад кіраваннем дырыжора Ашрафа Гасанава закончыў увертуру, у зале раздаліся шумныя апладысменты.

З неаслабнай цікавасцю сачылі прысутныя за развіццём дзеі оперы, пабудаванай на аснове старажытнага сказання аб слаўным героі Кёр-Оглы, якога народ надзяліў выдатнымі якасцямі — сілай, смеласцю, знаходлівасцю, мужнасцю.

Галоўныя партыі ў гэты дзень выконвалі заслужаны артыст АзССР Бюль-Бюль (Кёр-Оглы), салістка Кнарык Грыгар'ян (Нігар, каханая Кёр-Оглы), заслужаны артыст АзССР М. Т. Багіраў (Гасан) і інш.

Вялікае ўражанне пакінулі вельмі добра пастаўленыя масавыя сцэны. Стройна, зладжана гучалі хоры, якія вылучаюцца высокай музыкальнай культурай. Шумнымі апладысментамі суправаджаліся азербайджанскія народныя танцы. Узоры выдатнага майстэрства, як і ў папярэдніх спектаклях, прадэманстравала салістка балета Гамер Алмаз-Задэ. Народна-гераічная опера «Кёр-Оглы» мела велізарны поспех. На спектаклі прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, В. Я. Чубар, А. І. Мікаян, Н. І. Ежоў, М. Д. Багіраў.

Па сканчэнні оперы гледачы наладзілі ўдзельнікам спектакля гарачую авацыю.





Удзельнікі дэкады: рэжысёр Азербайджанскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава — А. Іскендэраў, народная артыстка АзССР Шаўкет Мамедава, заслужаны артыст АзССР Гаджыбабекаў.

МАЯКОЎСКІ—МАЙСТАР ВЕРША

Маякоўскі выступае ў нашай літаратуры не толькі як пісьменнік-практык, але і як тэарэтык паэтычнага майстэрства. У сваіх артыкулах, прамовах, вершах ён часта выказваўся па пытаннях паэзіі. Погляды Маякоўскага за мастацтва, не глядзячы на поўную эвалюцыю, адзіны. Сацыяльны пратэст, з якім Маякоўскі выступіў у літаратуры, абумовіў пратэст і літаратурны.

Паэзія Маякоўскага ўяўляе сабой яркае выступленне супроць усіх і ўсякіх прынцыпаў і догм буржуазна-дваранскай эстэтыкі. «Калі ўстануць, — гаварыў ён, — з дамавіны ўсе паэты, яны павінны сказаць: «У нас такіх вершаў не было—і не ведалі, і не ўмелі». Выходзячы з гэтых установак, ён ламае усе раней устаноўленыя літаратурныя каноны. Смела ўводзіць ён у паэтычны ўжытак мову вуліцы з яе дыялектамі і жаргонамі. У яго слоўніку мы знаходзім шмат рэзкіх саркастычных вобразаў, якія моцна білі буржуазію:

Пусть в сале совсем потонули
зрачки,
Все равно их зря отец твой
выделал.
На слепую кишку хоть надень
очки,
Кишка все равно ничего-б не
видела.

Ён бязлітасна разбурае падроўненыя радкі і ўстаноўленыя «со времени она» размеры вершаскладання, ствараючы свае самыя разнастайныя і самыя цікавыя рытмічныя інтанацыі. «З размераў,—пісаў Маякоўскі,—я не ведаю ні аднаго. Я проста перакананы, што для гераічных, альбо ўзвышаных момантаў трэба браць доўгі размер з вялікай колькасцю слоў, а для вясёлых — кароткія... Размер у мяне атрымліваецца ў выніку пакрыцця рытмічнага гулу словамі, высоўваемымі мэтавай устаноўкай» («Як рабіць вершы»).

Маякоўскі увёў маршавыя, баявыя, паходныя рытмы для масавых песень, накшталт:

Шагай
Круче
Целься
Лучше.

(«Возьмем винтовки новые»).

Сэнсаваму такту твора Маякоўскі падпарадкоўвае і строфіку верша і свой паэтычны сінтаксіс, прыбягаючы да самых разнастайных інверсій.

Распрабабкиной техники
скидывай хлам.
Днепр,
турбины
верти по заводам
(«Марш ударных бригад»).

Маякоўскі, вольна аперыруючы прыстаўкамі, суфіксамі і г. д., шырока выкарыстоўвае стварэнне новых слоў: «Цветоморье — море цветов», «испешеходить — исходить пешком», «прижаблен — прижат как жаба», «истемнить» і г. д.

Для многіх твораў Маякоўскага характэрны паэтычныя звароты, надаючыя вершу характар аратарскай прамовы.

Слушайте,
товарищи потомки,
агитатора
горлана-главаря...

У галіне рыфмоўкі Маякоўскі таксама рэзка адштурхоўваўся ад «класічных» крытэрыяў. Ён прытрымліваўся больш асанансу, чым празмерна поўных рыфм. Бо «калі вы гаворыце, — пісаў Маякоўскі, — «резвость», дык рыфма «трезвость» напрашваецца сама сабой і, будучы вымаўленай, не здзіўляе, не прыцягвае вашай увагі». За рыфмы Маякоўскі выбірае самыя характэрныя, самыя моцныя словы. «Мая рыфмоўка, — казаў ён, — амаль заўжды незвычайная». І гэта сапраўды так.

Милкой мне в подарок бурка
и носки подарены.
Мчит Юденич с Петербурга,
как наскипидаренный.

Ужываў Маякоўскі рыфму і ў пачатку радкоў, і ў канцы, і пасярод, рыфмаваў таксама канец аднаго радка з пачаткам другога:

Угрюмый дождь скосил глаза.
И за решеткой, четкой... і г. д.

Выходзячы з гэтай сваёй практыкі, ён звычайнае азначэнне рыфмы, як сугучнасць апошніх слоў у двух радках, калі адзін і той-жа націскны галосны і паследуючыя за імі гукі супадаюць, называў «ерундой».

Маякоўскі шырока ўжываў прыёмы алітэрацыі, але і тут рэзка парываў са старымі паэтамі, якія карысталіся гэтым прыёмам толькі, альбо галоўным чынам, для меладычнасці, музычнасці мовы. «Я прыбягаю да алітэрацыі, — гаварыў ён, — для абрамлення, для яшчэ большай падкрэсленасці важнага для мяне слова». Як прыклад яснай алітэрацыі сам Маякоўскі прыводзіў наступны радок з верша «Сергею Есенину»:

Где он бронзы звон, или гранита
грань

Маякоўскі звяртаў надзвычай вялікую ўвагу на тэхнічную апрацоўку верша, вось чаму і характарызаваў паэзію, як здабычу радыя.

В грамм добыча —
в год труды.
Изводишь
единого слова ради
Тысячи тонн
словесной руды

Усю сваю паэтычную тэхніку Маякоўскі падпарадкоўваў адной мэце—больш наглядна і пераканаўча выявіць сваю тэндэнцыю, больш актыўна ўздзейнічаць на чытача, мабілізаваць і выхоўваць яго ў патрэбным сацыялістычнаму грамадству напрамку. Ён гаварыў: «Трэба быць перадавым барацьбітом свайго класа, трэба разам з класам весці барацьбу на ўсіх франтах. Трэба разбіць нашчэнт казку аб апалітычным мастацтве... Паэзія пачынаецца там, дзе ёсць тэндэнцыя».

А. ГУТАРАЎ.

Маякоўскі—мастак РОСТА

«Я ўвайшоў у досыць прасторны пакой.

...Абыйшоўшы некалькі сядзеўшых на падлозе таварышоў і кучы флаконаў з фарбамі, я прадстаў перад высокім і стройным чалавекам з вялікім адкрытым тварам. Гэта быў Маякоўскі. Апрануты ў чорнае паліто і чорную круглую шапачку, ён ствараў уражанне моцнага і здаровага фізічна чалавека. Адчувалася якаясьці асаблівая магутнасць, магутнасць спартанца. Ён штосьці маляваў, абкружаны некалькімі таварышамі; мой прыход адарваў яго ад работы...»

Так апісвае сваё наведанне мастацкага аддзела Расійскага тэлеграфнага агенцтва (РОСТА) курсант Барысаў.

А вось сведчанне самога Маякоўскага:

«...Работа ў велізарнай неацепленай, зводзячай марозам (пазней выядаючая вочы дымам буржуйка) майстэрні РОСТА»... «Клаўся спаць, падклаўшы пад галаву не падушку, а проста палена, каб не праспаць і паспець у час абвесці вейкі розным Юдэнічам і Дзенікіным».

Так рабіліся славутыя «Вокны РОСТА».

Кожнае «вакно» — гэта вялікі ліст шэрай паперы (ад аднаго да трох метраў), на якім наклеена ад 4 да 14 рысункаў, паслядоўна раскрываючых адну тэму. Рысункі аб'яднаны агульным тэкстам і нумарам. Такія плакаты размнажваліся пры дапамозе трафарэта да 100 экземпляраў і вывешваліся ў вітрынах пустуючых магазінаў (адсюль назва), агітпунктах і іншых людных месцах. Паведамленне, атрыманае раніцой па тэлеграфу, у той-жа дзень вісела на вуліцы маляўнічым плакатам.

Маякоўскі прышоў у РОСТА ў дні, калі Савецкая Рэспубліка адбівалася ад наступаючай з усіх бакоў генеральскай контррэвалюцыі. Тут ён знайшоў прыстасаванне сваім сілам і як паэт і як мастак.

Плакаты Маякоўскага цікавы не толькі як «малюнкі» паэта. Маякоўскі выступае ў іх як спелы мастак, спелы майстар палітычнага плаката і палітычнай карыкатуры.

«Па-за тэлеграфнай, кулямётнай хуткасцю, — пісаў ён, — гэтай работы быць не магло, але мы рабілі яе не толькі на поўную сілу і сур'ёзнасць нашых уменняў, а рэвалюцыянізіравалі густ, узнімалі кваліфікацыю плакатнага мастацтва, майстэрства агітацыі. Калі ёсць рэч, іменуемая ў малюнку «рэвалюцыйны стыль», гэта стыль нашых вакон».

Малюнак і тэкст у «вокнах»» звычайна шчыльна звязаны адно з другім, і тое і другое надзвычай сціслае і дынамічнае. Толькі галоўнае, нічога другараднага.

У прадмове да прыжыццёвага зборніка «Вокны РОСТА» Маякоўскі пісаў: «Для мяне гэта—кніга вялікага слоўнага значэння, работа, якая ачышчае нашу мову ад паэтычнага шалупіння на тэмах, не дапускаючых шматслоўя».

Такім чынам «Вокны РОСТА» гэта не толькі найцікавейшыя гісторыка-рэвалюцыйныя дакументы, не толькі адна з яркіх старонак гісторыі савецкага мастацтва, але і значны літаратурны факт. «Вокны РОСТА» — гэта важнейшы этап у творчым росце «лепшага, таленавіцейшага паэта нашай савецкай эпохі» (Сталін).

Калі ўдасца сабраць усе «Вокны РОСТА», дык разам яны складуць выразны і маляўнічы летапіс першых год рэвалюцыі. Але «Вокны РОСТА» не толькі гісторыя. Нягледзячы на амаль дваццацігадовы адрэзак часу, які аддзяляе іх ад сёння, многія з іх і цяпер гучаць актуальна:

1. Мы добили русских белогвардейцев
Этого мало,
2. Еще живет чудовище
мирового капитала.
3. Значит нужна еще
Армия Красная,
4. Значит, и помогать ей нужно —
дело ясное.

(РОСТА № 729)

Гаворачы словамі Маякоўскага, «гэта не столькі вершы, колькі падручнік для тых часоў, калі прыдзецца крыкнуць:

Голой рукой
нас не возьмеш.
Товарищи,
все за оружие!
Красная Армия —
красный еж;
железная сила,
содружие».

За апошні час у Дзяржаўным літаратурным музеі ўдалося сабраць вялікую калекцыю «Вакон РОСТА». Гэта калекцыя складаецца з 400 арыгіналаў плакатаў і каля 900 фотаздымкаў. Значная частка з іх рысавана Маякоўскім і тэксты ў большасці напісаны ім.

В. ДУВАКІН.





«Вокны Роста». Плакаты работы В. В. Маякоўскага.

А. МАЯКОЎСКІ

ШТО ТАКОЕ ДОБРА І ШТО ТАКОЕ ДРЭННА*)

Сын маленькі
к бацьку
падышоў спытацца:
— Што такое
добра
і што такое
дрэнна? —
Як мне разабрацца?
Я падслухаў,
і для вас,
малалеткі, мігам
бацькі гэтага
адказ
запісаў
у кнігу.
. . . .
Калі хлопчык, як дзівак,
кніжкі рве
і топча,
оцябраты кажуць так:
дрэнняваты хлопчык.
Калі любіць,
працаваць,
да навук
ахвочы, —
пра яго
трэба сказаць:
гэта
добры хлопчык.
Ад вароны
карапуз
уцякае з крыкам.
Гэты хлопчык
проста трус,
ды яшчэ
вялікі.
Гэты,
хоць з вяршок хлапец,
птушак
не баіцца.
Ён адважны,
маладзец,
ёсць чым
пахваліцца.
Гэты
у гразь палез
і рады,
што ў гразі кашуля.
Пра такога
оцябраты
кажуць:
ён гразнуля.
Гэты
хлопчык заўжды
мые
сам
галошы.
Хоць малы ён,
праўда,
ды зусім харошы.
Помні
гэта
кожны сын,
кожны знай
дзіцёнак:
з сына
вырасце
свін,
калі сын —
свінёнак.
Хлопчык вельмі
рады быў,
і рашыў сумленна:
«Буду
добра я рабіць
і не буду —
дрэнна».

Пераклаў А. ЯКІМОВІЧ.

*) Друкуецца ў скарочаным выглядзе.

Г. КРАСНЕЎСКІ

ПАЭТ РЭВОЛЮЦЫІ

Вялікі Гётэ ў сваім «Фаусце», вызначаючы філасофію чалавечага жыцця,—пісаў:

Лишь тот достоин жизни и свободы,
Кто каждый день за них идет на бой.

Такім чалавекам і паэтам быў і застаецца Владзімір Владзіміравіч Маякоўскі, які казаў пра сябе:

Ненавижу всяческую мертвечину!
Обожаю всяческую жизнь!

Поўнакроўная любоў паэта да жыцця—яркага, кіпучага, вечнага—напаўняе сабой яго таленавітыя творы і робіць іх жывымі, неўміручымі. Таму кожная гадавіна смерці Маякоўскага ў нашай Савецкай краіне не нагадвае якойсьці грамадска-літаратурнай паніхіды, а з'яўляецца сустрэчай жывых людзей з жывым і любімым паэтам.

Тысячы чытачоў—сяброў, паклоннікаў Маякоўскага, усхваляваных яго магутным голасам паэта-агітатара, паэта-барацьбіта за комунізм, ускліянуць у гонар жыцця ягоныя любімыя словы:

И жизнь хороша,
И жить хорошо!

Маякоўскі застаецца сярод жывых таму, што ён, любячы нашу рэчаіснасць, «нашых планов громадьё», адчуваў сонечную будучыню комунізма і змагаўся за набліжэнне гэтага сонечнага заўтра, чула выражаючы думкі і пачуцці народа.

Маякоўскі — змагар бачыў лепшы помнік сабе ў «построенном в боях социализме». Соцыялізм у нашай краіне пабудаван. «Наш народ жыве па-новаму, бо соцыялізм пранікнуў ва ўсе поры нашага ладу. Гэта новае жыццё акрыляе працоўных, нараджае ў іх новыя і новыя сілы». (Молатаў) *). Сонца вялікай Сталінскай Канстытуцыі ярка свеціць на неабсяжных прасторах нашай магутнай і шчаслівай радзімы.

Неўгасімая нянавісць Маякоўскага да капіталістычнага рабства, да ўсіх ворагаў і эксплаататараў працоўных, да здраднікаў радзімы — гэтыя рысы непартыйнага бальшэвіка робяць яго паэзію жывой вострай зброяй для нас. Вось чаму ворагі Маякоўскага (яны-ж і ворагі народа) як пры жыцці, так і пасля смерці травілі і шальмавалі паэта, імкнучыся адарваць імя Маякоўскага ад пролетарыята і рэвалюцыі.

Адзін з гнюснейшых ворагаў народа—Бухарын нахабна паклёпнічаў на рэвалюцыйную паэзію Маякоўскага. На бандытаў з трацкісцка-бухарынскай шайкі кожнае грамавое рэвалюцыйнае слова Маякоўскага падала смяротным ударам. Вось чаму яны яго ненавідзелі. Подлыя намеры ворагаў, якія імкнуліся прынізіць значэнне рэвалюцыйнай паэзіі Маякоўскага, былі выкрыты і разбіты таварышом Сталіным, які даў вычарпальную. глыбокую ацэнку дзейнасці Маякоўскага і значэння яго творчасці: «Маякоўскі быў і застаецца лепшым, таленавіцейшым паэтам нашай совецкай эпохі. Абыякавасць да яго памяці і яго твораў—злачынства».

Наша партыя і народ прысвоілі Маякоўскаму высокае званне паэта рэвалюцыі. Ён заваяваў яго сваёй благароднай паэтычнай дзейнасцю, усёй сваёй мужнай, чэснай барацьбой пад сцягам рэвалюцыі.

Шлях Маякоўскага, як і ўсякага сапраўды таленавітага паэта, меў нямала перашкод, супярэчнасцей, традыцый, якія яму прыходзілася перамагаць. Мы не можам асвятліць тут усе перыпетыі гэтага складанага творчага шляху. Абмяжуемся толькі ўказаннямі на тыя асноўныя моманты, якія дапамаглі Маякоўскаму, перамагчы супярэчнасці і знайсці правільны шлях да рэвалюцыі.

Вялікую ролю ў фарміраванні светапогляду Маякоўскага-юнака, будучага рэвалюцыйнага паэта, адыграла яго прапагандысцкая работа ў радах партыі і знаёмства з марксізмам. На Маякоўскага аказаў таксама вялікі ўплыў рэвалюцыйны гуманізм вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага, які першым празорліва ўбачыў пад футурызмам ранняга Маякоўскага будучага таленавіцейшага паэта. А. М. Горкі запрасіў Маякоўскага ў 1915 годзе ўдзельнічаць у рэдагаваным ім журнале «Летопись». У «Вайне і міры» мы асабліва адчуваем здаровыя павевы горкаўскага гуманізма і інтэрнацыяналізма.

Нарэшце важнейшым фактам гістарычнага парадку, аказаўшым рашаючы ўплыў на яго светапогляд і выбар ідэйнага шляху, з'явіўся рэвалюцыйны ўздым рабочага класа ў 1912—14 гг., які пад сцягам партыі Леніна—Сталіна рыхтаваўся да апошняга штурму на самадзяржаўе і капіталізм.

Асвяжаючае дыханне рэвалюцыі пролетарыята для паэта вялікага розуму і чуткага сэрца, якім быў Маякоўскі, не магло прайсці бясследна. Ён—бунтар-паэт, які да болю ненавідзеў стары свет—свет золата, крыві і бруду, ён, страсны гуманіст-утапіст, які верыў у прыход «новага чалавека», паэт-гарлан і пяшчотнейшы лірык, ён інстынктам мастака адчуў у пролетарыяце надзейную соцыяльную апору і смела пайшоў насустрач класу-барацьбіту, будаўніку новага свету.

Яшчэ ў паэме «Воблака ў штанах» (1915), якую Маякоўскі разглядаў як выстрал па буржуазна-капіталістычнаму ладу, па яго рэлігіі, любві і мастацтву («четыре крика четырех частей»), ён адчуваў набліжэнне рэвалюцыі:

Где глаз людей обрывается куцый,
главой голодных орд,
в терновом венце революций
грядет шестнадцатый год.

Падзеі імперыялістычнай бойні 1914—18 гг., паскорылі працэс росту яго рэвалюцыйнай свядомасці. Маякоўскі пасля Лютаўскай рэвалюцыі хутка распазнае здрадніцкі твар кадэцка-меншавіцка-эсэраўскай зграі, якая прадавала радзіму і душыла рэвалюцыю. Ён клейміць гэтую зграю ў радзе гнеўных рэвалюцыйных вершаў («Да адказу» «Казка аб чырвонай шапачцы» і інш.).

Калі прышла Вялікая пролетарская рэвалюцыя, перад паэтам не пастаўвала пытанне: «Прымаць, ці не прымаць?» «Мая рэвалюцыя»—у гэтых словах паэта няма бахвальства, яны зусім шчырыя і праўдзівыя.

На сходзе работнікаў мастацтваў у Ленінградзе 17—30 лістапада 1917 года Маякоўскі лаканічна і мужна заявіў:

«Трэба вітаць новую ўладу і ўвайсці з ёю ў кантакт».

З гэтага гістарычнага моманту пачынаецца самаадданае, страснае служэнне Владзіміра Владзіміравіча соцыялістычнай рэвалюцыі. Гэта служэнне не было якойсці афярай з боку паэта: не, яно было справай яго жыцця, шчырым усведамленнем правоты, прыгажосці і велічы ідэалаў комунізма. Вось чаму Маякоўскі так упэўнена і мужна змагаўся і тварыў пад сцягам Леніна—Сталіна.

Маякоўскі прышоў да рэвалюцыі як кваліфікаваны майстар, са значнай паэтычнай культурай. Ён выпрацаваў ужо арыгінальны аратарскі стыль, сваё разуменне мастацкага вобраза, мову плошчаў і вуліц, свае размеры, рытмы і графічнае афармленне верша. Ён быў паэтам-наватарам, які ўмеў крытычна спалучаць культуру класічнага верша з новымі патрабаваннямі часу, з заданнямі рэвалюцыі («Загад па арміі мастацтваў», «Левы марш» і інш.).

Соцыялістычная рэвалюцыя, даўшы Маякоўскаму новы змест, удасканаліла, узбагаціла і яго паэтычную форму. З кожным новым творам паэт усё больш упэўнена авалодвае стылем соцыялістычнага рэалізма, мудрасцю і прастатой народнай мовы, яснасцю паэтычнай структуры твораў, адкідаючы ўсё штучнае і шкоднае для рэвалюцыйнай паэзіі.

Сваё рэалістычна-сатырычнае майстэрства, памножанае на палітычнае чуццё, Маякоўскі бліскуча прадэманстраваў ужо ў сваіх вершах-надпісах да агітплакатаў «Роста», якія білі па ворагах рэспублікі—дзенікіных, врангелях, пілсудскіх, махно—з трапнасцю чырвонаармейскіх куль.

Маякоўскі з гордасцю пісаў аб гэтых вершах:

«Гэта не толькі вершы... Гэта—пратакольны запіс найцяжэйшага трохгоддзя рэвалюцыйнай барацьбы, перададзены плямамі фарбаў і звонам лозунгаў. Гэта—мая частка велізарнейшай агітработы вокнаў сатыры Роста. Няхай успамінаюць лірыкі вершыкі, пад якія ўлюбляліся. Мы рады ўспомніць і радкі, пад якія Дзенікін бег з-пад Орла»*/.

Агіткі Маякоўскага эпохі грамадзянскай вайны—не музейная рэліквія: яны яшчэ спатрэбяцца нам у прадстаячай барацьбе з ворагамі радзімы.

Маякоўскі, шчыра аддаючы «всю свою звонкую силу поэта» пролетарыяту, стварыў грандыёзную паэму «Владзімір Ільіч Ленін»—гімн вялікаму правадыру чалавецтва і створанай ім партыі. Адна гэта паэма магла-б абяссмерціць імя Маякоўскага. У сурова-эпічных і пяшчотна лірычных радках гэтай паэмы дадзена карціна гіганцкай гістарычнай барацьбы пролетарыята. Тут мы знаходзім любоўна і таленавіта паказаныя рысы дарагога чалавецтву вобраза Владзіміра Ільіча Леніна і незабыўнае развітанне народа з памёршым Ільічом. Паэт спявае свой пафасны гімн слаўнаму авангарду пролетарыята, яго «мозгу, славе, силе»—партыі Леніна—Сталіна.

Партия и Ленин —
близнецы-братья, —
Кто более
матери—истории ценен?
Мы говорим—Ленин,
подразумеваем —
партия,
мы говорим —
партия,
подразумеваем—Ленин.

Гэта—не проста словы, а арганічнае, кроўнае перакананне паэта, які моцна верыў у партыю Леніна—Сталіна і для якога слова комунізм—«могучая музыка, могущая мертвых сражаться поднять».

Пачуццё паэта-большэвіка натхняла яго талент пры стварэнні другой магутнай паэмы «Хорошо» (1927)—гімна перамагаючаму соцыялізму ў СССР. І тут паэт адчувае сябе будаўніком соцыялізма, гордым ад усведамлення велічы праробленай калектывам совецкага народа работы. «С такой землею пойдешь на жизнь, на труд, на праздник и на смерть» — натхнёна пісаў паэт.

Поэма «Хорошо» была трапным стрэлам па трацкісцка-зіноўеўскіх і бухарынскіх здрадніках, якія вялі шалёную барацьбу супроць пабудовы соцыялізма ў СССР.

Поўнацэнны рэалізм і ясны, сапраўды народны аптымізм паэмы клікалі байцоў соцыялізма да новых перамог. Заключны акорд паэмы гучыць ва ўнісон сёнешнім радасным песням нашага народа.

Жизнь прекрасна
и
удивительна.
Лет до ста
расти
нам
без старости.
Год от года
расти
нашей бодрости.
Славьте,
молот
и стих,
землю молодости.

Майстар вялікіх эпіка-рэвалюцыйных палотнаў, Маякоўскі быў выдатным майстрам публіцыстычнай паэзіі, паэтам-газетчыкам, «чернорабочим революции».

Ён з вялікім натхненнем і майстэрствам агітуе за культурную рэвалюцыю, за ўмацненне абароны краіны, граміць бюракратызм, мяшчанства, бічуе двурушнікаў, ворагаў партыі; радуецца першым поспехам індустрыялізацыі; радуецца разам з рабочым, атрымаўшым новую кватэру; вучыць нашу моладзь совецкаму патрыятызму і заве яе «рабіць жыццё па Феліксу Дзержынскаму»; піша рэкламы для совецкіх трэстаў; пяшчотна адгукаецца на патрабаванні дзетвары, — адным словам, ён нястомны, шчыры і страсны агітатар — бальшэвік.

Сваё натхненне, думкі, словы, веданне жыцця Маякоўскі прыгаршчамі чэрпаў з жывой крыніцы, імя якой — маса, народ. З народам паэт моцна і дзейсна быў звязан заўсёды. Маякоўскі ўкладваў у свае агіткі ўсё сваё вялікае майстэрства і агністасць велічнага сэрца. Ён быў «взыскательным художником» у самым глыбокім сэнсе слова ў адносінах да самога сябе і да другіх. Таму ён ненавідзеў пошленькіх мандалінщыкаў, з «их стихом холодным и ляпащим», пыпікаў і багема-есенінскіх забулдыгаў ад паэзіі. Ён кляйміў іх сваім вострым і мужным словам.

Маякоўскі, неаднаразова бываючы за межамі СССР, усюды заставаўся самім сабою: паэтам рэвалюцыі, інтэрнацыяналістам, другам прыгнечаных усіх нацый і непрымірымым ворагам капіталізма і фашызма. Дамініруючае яго пачуццё ў бытнасць за мяжой — гэта пачуццё найвялікшага совецкага патрыёта, сына сваёй радзімы. «Читайте, завидуйте, я — гражданин Советского Союза» — горда заяўляў паэт у вершах «Аб совецкім пашпарце». У вершы «Дамоў» з цыкла «амерыканскіх вершаў» ён пісаў:

Я себя
советским чувствую
заводом,
вырабатывающим счастье.

Высока ацэньваючы работу паэта, ён бачыў вышэйшую для сябе ацэнку ў тым, каб «о работе стихов от Политбюро чтобы делал доклады Сталин».

Гарачы патрыёт сваёй радзімы, рэаліст з арлінымі зрокам, нацэленым у будучыню, Маякоўскі стварыў дзесяткі шэдэўраў совецкай і сусветнай грамадзянскай лірыкі, напамінаючай сабою Гейне, Пушкіна, Некрасава. Назаўсёды застануцца ў сэрцы нашага народа такія яго рэчы, як «Вершы аб совецкім пашпарце». «Юбілейнае», «Таварышу Неттэ», «На ўвесь голас» і дзесяткі іншых. Сотні яго вершаў-сатыр, «оружия любимейшего род», будуць і надалей трапна біць па ворагу.

Магутным манументам будуць узвышацца ў вяках яго большэвіцкія паэмы-гімны «Владзімір Ільіч Ленін» і «Хорошо». Яны заўсёды будуць не толькі прыгожым помнікам гераічнай эпохі, але і жывым заклікам да новых перамог совецкага народа — перамог на славу любімай радзімы-маці.

Так Владзімір Маякоўскі, паэт рэвалюцыі, падобна магутнаму акеанскаму параходу, перамагаў мелкаводдзе лефаўскіх тэорый, брудныя хвалі паклёпаў трацкісцка-бухарынскіх ворагаў, нязменна трымаючы свой курс на маяк комунізма.

На паэтычнай мачце гэтага чалавека-парахода горда палыхаў чырвоны сцяг партыі Леніна—Сталіна.

Пад гэтым слаўным сцягам ён перамагаў у жыцці і перамагае пасля сваёй фізічнай смерці, падрыхтаванай подлымі дантэсамі з трацкісцка-авербахаўскай шпіёнскай шайкі, якіх народ знішчаў і будзе знішчаць да канца.

Назаўсёды застанецца жыць «весомо, грубо, зримо» і страсна заклікаць да барацьбы за шчасце народа «все сто томов партийных книжек» Маякоўскага.

У «коммунистическое завтра» Маякоўскі ішоў і ідзе з народам, з партыяй, з любімым Сталіным як выдатнейшы грамадзянін, таварыш, таленавіцейшы паэт совецкай эпохі і баец за комунізм.

* В. М. Молатаў. «Да 20-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі». Партвыдат, 1937, стар. 29.

*/ В. Маякоўскі, Зб. тв., ГІХЛ, 1933, т. X, стар. 7.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

РАБОТА, ЯКАЯ НЕ ЗАДАВАЛЬНЯЕ

Што можам мы сказаць аб рабоце нашай партыйнай арганізацыі? Ці справілася яна з тымі велізарнейшымі задачамі, якія пастаўлены перад ёй комуністычнай партыяй і ўсёй нашай краінай? Як выхоўвала яна комуністаў, як выхоўвала беспартыйных таварышоў? Наколькі клапацілася яна аб непарушнасці блока комуністаў і беспартыйных? Наколькі займалася яна нашымі непасрэднымі творчымі пытаннямі?

Партыйная арганізацыя Саюза савецкіх пісьменнікаў невялікая па колькасці членаў: у ёй усяго некалькі комуністаў — пісьменнікаў і работнікаў апарата. Гэта, зразумела, ніякім чынам не апраўдвае вялікіх недахопаў і зрываў, якія былі і ёсць у жыцці арганізацыі, закліканай кіраваць адным з важнейшых участкаў нашай культуры—беларускай савецкай літаратурай. Задачы перад партыйнай арганізацыяй сталі выключна вялікія. Трэба было выкарчоўваць рэшткі варожых элементаў, трэба было як найхутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва нацыянал-фашыстаў і іншых ворагаў, якія рабілі спробы палараваць літаратуру, зрабіць яе сваёй зброяй, спрабавалі разлагаць літаратурнае асяроддзе.

Партыйная арганізацыя правяла не малую работу за мінулы год. Яна змагалася не толькі за чыстату сваіх радоў, але і за чыстату ўсяго нашага літаратурнага асяроддзя. Уся літаратурная арганізацыя паказала прыклад не кепскай работы ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Непасрэдным удзелам у перадвыбарчай рабоце, мастацкімі выступленнямі на перадвыбарчых сходах, у прэсе, спецыяльнымі выездамі ў раёны нашы пісьменнікі — і комуністы, і беспартыйныя — дапамагалі партыі і савецкай грамадскасці ў практычным правядзенні ў жыццё вялікай Сталінскай Канстытуцыі. Цяпер прымаюцца ўсе захады да таго, каб пісьменніцкая арганізацыя, скарыстаўшы вопыт свайго ўдзелу ў выбарах у Вярхоўны Совет СССР, правяла яшчэ лепш сваю работу па падрыхтоўцы да выбараў і ўдзелу ў саміх выбарах у Вярхоўны Совет БССР.

Можна гаварыць яшчэ аб цэлым радзе станоўчых момантаў у жыцці нашай партыйнай арганізацыі. Але сёння, напярэдадні выбараў кіруючых партыйных органаў, мы павінны завастрыць сваю ўвагу на нашых недахопах, на ўсім тым, што перашкаджае рабоце, ад чаго мы павінны пазбавіцца, каб наладзіць нармальную, баявую работу арганізацыі.

Калі ў жыцці нашай партыйнай арганізацыі мы не сустракаліся з такімі адмоўнымі з'явішчамі, як памылкі пры выключэнні членаў партыі, то мы мелі другое ганебнае з'явішча: мы не здолелі своечасова выкрыць гняздо трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх эмяёнышаў у нашай літаратурнай арганізацыі. Не выкрылі мы і тых з іх, хто сваю бандыцкую сутнасць маскіраваў партыйным білетам. Гэты бяспрыкладна цяжкі ўрок, які перажылі мы, павінен навучыць нас своечасова распазнаваць звярынае аблічча ворага і ставіць наогул усю нашу работу так, каб ніякі вораг не пасмеў нават думаць аб магчымасці пранікнуць у наша асяроддзе.

Мала, надзвычай мала зроблена ў нас у справе партыйнай асветы, у справе авалодання марксісцка-ленінскім вучэннем. Праведзеныя заняткі,— іх было вельмі мала, — не далі патрэбных вынікаў, і не далі таму, што мы не здолелі дыферэнцыявана падысці да кожнага партыйца, не ўлічылі розніцы ў палітычным і агульнакультурным узроўні кожнага комуніста. І нічога не было зроблена для палітычнай асветы беспартыйных таварышоў.

Кепска мы кіравалі комсамольскай арганізацыяй і наогул нашай пісьменніцкай моладдзю. А справы тут непачаты край. На моладзь не звярталася належнай увагі, ні разу не ставілася па-сур'ёзнаму пытанне аб росце нашай партыйнай арганізацыі за лік комсамольцаў, за лік падрастаючай таленавітай моладзі. А моладзь такая ёсць. Наогул партыйная работа з беспартыйнымі таварышамі ў нас жадае шмат і шмат лепшага.

Адным з буйнейшых недахопаў у жыцці партыйнай арганізацыі з'яўляецца даволі індыферэнтнае стаўленне да асноўных пытанняў нашай работы, да пытанняў творчых. Тут патрэбна рашучая перабудова. Партыйны сход павінен займацца творчай работай кожнага комуніста і займацца сур'ёзна. Ды будзе не кепска, калі партыйная арганізацыя зоймецца творчасцю і беспартыйнага таварыша і акажа яму належную дапамогу. Пытанні непасрэднай творчай работы трэба ставіць і на закрытых і на адкрытых партыйных сходах. Дарэчы, мы толькі ў апошнія часы правялі амаль што першы адкрыты партыйны сход (на якім ставілі пытанне аб міжнародным становішчы). Такія сходы трэба практыкаваць часцей.

Што яшчэ трэба зрабіць нам для палепшання ўсёй нашай партыйнай работы? Неабходна папоўніць партыйную арганізацыю новымі людзьмі і ўзмацніць яе. Райкому і гаркому КП(б)Б трэба бліжэй заняцца нашай работай, нашым жыццём, бо трэба сказаць, што кіраўніцтва з іх боку жадае шмат лепшага, вельмі мала яны цікавіліся нашай арганізацыяй, мала кіравалі і мала дапамагалі.

Перашкаджала, да некаторай ступені, у нашай рабоце і тая акалічнасць, што на працягу апошняга года кіраўніцтва Саюзам і партыйнай арганізацыяй было з'асяродкавана ў адных руках.

Вось каротка аб асноўных недахопах работы нашай партыйнай арганізацыі, якіх мы павінны як мага хутчэй пазбавіцца з тым, каб з гонарам спраўляцца з вялікімі задачамі будаўніцтва беларускай савецкай культуры і беларускай савецкай літаратуры ў прыватнасці. Толькі тады мы поўнасцю апраўдаем званне членаў вялікай партыі Леніна—Сталіна, партыі будаўнікоў перамогшага социялізма.

Міхась ЛЫНЬКОЎ,
парторг Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР.

ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР

Міхась Калачынскі

ВЫБАРЧАЯ ПЕСНЯ

Сагрэты сузор'ем крамлёўскім
Зямлі беларускай прастор.
Квітнеюць заводы і вёскі
У бляску рубінавых зор.

Над нашым прымежным над краем
Ляціць ад іх промень яснот.
Народ беларускі спявае,
На выбары крочыць народ.

Ідзе з намі бацька вялікі
На светлае свята з Крэмля.
Іграйце, спявайце, музыкі!
Квітней, Беларусі зямля!

На ворага ў братнім саюзе
Ішлі ў дваццаты мы год.
Былі з намі сталінцы: Фрунзе,
Ежоў, Кагановіч, Серго.

Магнатаў, чужынцаў дачыста
З свяшчэнных загонаў змялі.
Святкуе сваю ўрачыстасць
Народ беларускай зямлі.

Ідзе з намі бацька вялікі
На светлае свята з Крэмля.
Іграйце, спявайце, музыкі!
Квітней, Беларусі зямля!

Мы помнім наказ аб граніцы,
Наказ твой, таварыш Ежоў,
Бы ўласнага вока зяніцу,
Заходні кардон беражом.

Не пройдуць па нашым па краі
Варожыя сілы нідзе.
Народ беларускі спявае
Пра выбарчы радасны дзень.

Ідзе з намі бацька вялікі
На светлае свята з Крэмля.
Іграйце, спявайце, музыкі!
Квітней, Беларусі зямля!

НА НАРАДЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ І КАМПАЗІТАРАЎ

10 красавіка ў Доме савецкага пісьменніка БССР адбылася нарада паэтаў і кампазітараў па пытанню падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Выступіўшыя на нарадзе тт. Колас, Купала, Цікоцкі, М. Лынькоў, Броўка, Падкавыраў, Гурчанка і другія адзначылі недастатковую актыўнасць Саюза савецкіх пісьменнікаў і секцыі кампазітараў у справе напісання масавых песень, прысвечаных выбарам. Напісанне песень аб ордэнаноснай рэспубліцы, аб шчаслівым жыцці горада і калгаснай вёскі, аб свабоднай беларускай жанчыне, аб кандыдатах у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР нарада прызнала неадкладнай задачай як для пісьменнікаў, так і для кампазітараў.

Акрамя таго, на нарадзе была прынята прапанова аб стварэнні калектыўнымі сіламі пісьменнікаў і кампазітараў вялікага арыгінальнага літаратурна-музыкальнага твора, прысвечанага выбарам. Па думцы выступаючых таварышоў, твор павінен уяўляць з сябе араторый, у які ўвойдуць вакальныя, рэчытатыўныя, драматычныя і хорэаграфічныя элементы.

Стварэнне ініцыятыўнай групы па напісанню літаратурна-музыкальнага араторыя, у якую ўвойдуць як пісьменнікі, так і кампазітары, даручана праўленню Саюза савецкіх пісьменнікаў.

А. Ш.

У секцыі драматургаў ССПБ

На днях адбылося пасяджэнне секцыі драматургаў ССПБ, прысвечанае вызначэнню мерапрыемстваў па ўдзелу ў выбарах у Вярхоўны Совет БССР.

На пасяджэнні з прапановамі выступалі тт. Лынькоў, Гурскі, Чорны, Крапіва, Рамановіч і інш. Усе выступаючыя гаварылі аб тым, што драматургам неабходна стварыць кароткія аднаактныя п'есы і вадэвілі, прысвечаныя выбарам.

Драматург К. Чорны даў абавязацельства напісаць п'есу пра выбары.

ШЫРЭЙ РАЗГАРНУЦЬ ПАЛІТЫЧНУЮ АГІТАЦЫЮ!

З вопыту работы пісьменнікаў БССР па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР відаць, што пры належнай актыўнасці з боку праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў можа зрабіць многае.

На працягу ўсёй перадвыбарчай кампаніі паэты выступалі на выбарчых участках з чытаннем вершаў, прысвечаных дэпутатам і дню выбараў, выступалі па радыё, многія пісьменнікі напісалі нарысы аб дэпутатах. Але вядома, што гэтага было зусім недастаткова, таму што некаторыя секцыі амаль ніякага ўдзелу ў перадвыбарчай кампаніі не прымалі.

Здавалася-б, што праўленне ССПБ павінна было ўлічыць усе мінусы сваёй работы ў прайшоўшай выбарчай кампаніі і выправіць іх, шырока разгарнуўшы падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Аднак, праўленне Саюза ў гэтай галіне не зрабіла яшчэ ні аднаго кроку, за выключэннем абмеркавання мерапрыемстваў на пасяджэнні секцый, на якіх ставілася пытанне аб напісанні твораў пра выбарчую кампанію.

Беларускі народ са здавальненнем будзе чытаць творы пра свае першыя выбары ў Беларускі савецкі парламент, на аснове Сталінскай Канстытуцыі, пра сваю квітнеючую Беларусь, пра сваіх дэпутатаў, пра работу на выбарчых участках, але гэтым не павінна абмяжоўвацца работа беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, драматургаў.

Перад ССПБ шырокае поле дзейнасці. Гэта — агітацыя за стопроцантны ўдзел у выбарах усіх маючых права выбіраць, гэта падрыхтоўка выбаршчыкаў да выбараў сродкамі штодзённай агітацыі.

Пісьменнікі, як майстры мастацкага слова, у галіне палітычнай агітацыі могуць зрабіць вельмі многае. Тут патрэбны і плакаты, і агіткі, і добра напісаныя нарысы, знаёмячыя выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, якіх у хуткім часе высунуць працоўныя прадпрыемстваў, социялістычных калгасаў, знаходзячыхся на тэрыторыі БССР часцей РСЧА.

Чаму-б, напрыклад, добра напісаныя агіткі аб выбарчай кампаніі, аб задачах выбаршчыкаў, аб кандыдатах, надрукаваныя лістоўкамі, не раскідаць з самалётаў? Чаму-б, скажам, добры электрыфіцыраваны вершаваны лозунг аб выбарах не ўстанавіць на трамваі? Вядома, усё гэта можна зрабіць. Трэба толькі мець жаданне і адчуваць свой грамадзянскі абавязак кожнаму пісьменніку. Савецкія ўстановы пойдуць насустрач гэтым мерапрыемствам.

Урачыстасць сталінскага выбарчага закона патрабуе ад кожнага пісьменніка, мастака, ад кожнага тэатра, каб афармленне выбараў было таксама ўрачыстым, каб народ адчуваў усю веліч самых дэмакратычных у свеце выбараў.

Нажаль, праўленне ССПБ гэтага пытання добра не прадумала, і работа секцый ССПБ пакідае жадаць лепшага.

Што рыхтуюць работнікі мастацтваў

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР распрацавала праграму падрыхтоўкі тэатраў, музычных устаноў, калектываў мастакоў і кампазітараў да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Аснова падрыхтоўкі— сур'ёзнае вывучэнне **самімі работнікамі мастацтваў** Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Толькі выдатнае веданне гэтых важнейшых палітычных дакументаў дасць магчымасць работнікам мастацтваў арганізаваць шырокую прапаганду іх сярод працоўных, дасць магчымасць найбольш ярка паказаць заваёвы Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, замацаваныя Сталінскай Канстытуцыяй.

Сярод мерапрыемстваў, вызначаных у парадку падрыхтоўкі да выбараў, асаблівай увагі заслугоўвае стварэнне ў нашых тэатрах спецыяльных **інтэрмедый** (невялікіх сцэнічна-музыкальных п'ес), прысвечаных выбарам у Вярхоўны Совет і нашым дасягненням. Такія інтэрмедыі павінны быць пастаўлены ў Белдзярждрамтэатры, дзяржаўным Яўрэйскім тэатры, Дзіцячым тэатры, Дзяржаўным Рускім тэатры, Віцебскім Дзяржаўным тэатры, у Тэатры оперы і балета і Тэатры музкамедыі. Інтэрмедыі павінны быць створаны непасрэдна тэатрамі, сіламі рэжысуры, драматургаў і пісьменнікаў.

Апрача інтэрмедый, тэатры рыхтуюць канцэртныя праграмы на тэму выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Канцэртамі будуць абслужаны фабрыкі, заводы, калгасы.

Калгасна-соўгасныя тэатры рыхтуюць канцэрты на тэму «Жыць стала лепш, жыць стала весялей». У канцэрты будуць уключаны мастацкае чытанне, танцавальна-музыкальныя нумары, спевы і г. д.

Ва ўсіх тэатрах будуць арганізаваны выстаўкі, прысвечаныя Сталінскай Канстытуцыі, росту социялістычнага будаўніцтва і культуры БССР. У калгасна-соўгасных тэатрах будуць арганізаваны перасовачныя выстаўкі.

Кожны тэатр прымацоўваецца да пэўных выбарчых участкаў. На тэатры ўскладаецца абавязак абслужыць прадвыбарчыя сходы канцэртамі, папулярызаваць кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Філармонія, Кансерваторыя, музычныя вучылішчы і школы арганізуюць спецыяльныя канцэрты да выбараў. У рэпертуары гэтых канцэртаў —«Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну». Арганізуецца выстаўка дасягненняў БССР у галіне развіцця музыкальнай культуры.

На мастакоў ускладзены абавязкі па мастацкаму ўпрыгожанню гарадоў — Менска, Віцебска, Магілева, Гомеля, Мазыра і інш.

У Доме саюза мастакоў арганізуецца выстаўка, прысвечаная выбарам у Вярхоўны Совет БССР.

Для аказання дапамогі калектывам мастацкай самадзейнасці тэатры вылучаюць каля пяцідзесяці чалавек, музычныя ўстановы — 65 чалавек і Саюз мастакоў — 15 чалавек.

Р. Б.

КІНО—ДА ВЫБАРАЎ

У падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР кіно, у прыватнасці кінаперасоўкі, павінна адыграць вялікую ролю. Зараз раённыя партыйныя арганізацыі прымацоўваюць да кінаперасовак, якія пранікаюць у самыя аддалёныя калгасы рэспублікі, спецыяльных агітатараў. Перад кінасеансамі агітатары будуць праводзіць гутаркі аб Сталінскай Канстытуцыі і выбарах у Вярхоўны Совет БССР.

Разгортваецца социялістычнае спаборніцтва сярод кінамеханікаў і шафёраў кінаперасовак на лепшае абслугоўванне выбарчай кампаніі.

Шырокае распаўсюджанне ў рабоце кінаперасовак атрымалі светавыя газеты на плёнцы. Створаныя на мясцовым матэрыяле, яны заклікаваны адыграць значную агітацыйную ролю, — будуць папулярызаваць выбарчыя лозунгі і расказваць аб кандыдатах у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

У дні падрыхтоўкі да выбараў на экранах кінотэатраў і перасовак будуць дэманстравацца лепшыя савецкія фільмы: «Ленін у Кастрычніку», «Балтыйцы», «Вялікі грамадзянін», «Мы з Кранштата» і інш.

Файе кінотэатраў будуць упрыгожаны лозунгамі, плакатамі, прысвечанымі выбарам. Арганізуюцца кансультацыі. Наведвальнікі кінотэатра атрымаюць у іх любую даведку па пытаннях выбараў.

Ва ўсіх кінотэатрах арганізуюцца выстаўкі дасягненняў СССР і БССР.

У Палескай вобласці арганізуецца кінофестываль лепшых фільмаў.

Значная работа будзе праведзена студыяй кінохронікі Белдзяржкіно. Будуць выпушчаны два спецыяльных гукавых кіно-журналы, прысвечаных падрыхтоўцы да выбараў і самім выбарам. У чарговыя гукавыя і нямыя кіно-журналы будзе ўключана звыш дваццаці сюжэтаў, прысвечаных выбарам. Апрача таго, будзе выпушчана пятнаццаць так-званых трохмінутак, прысвечаных кандыдатам у дэпутаты ў Вярхоўны Совет БССР.

Першыя фільмы аб вывучэнні Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР калгаснікамі Віцебскага раёна і хатнімі гаспадынямі Менска ўжо дэманстраваліся на экранах нашых кінотэатраў.

І. П.

Спаборніцтва на лепшую дзіцячую самадзейнасць

З 15 красавіка па 1 чэрвеня Белрадыёкамітэтам праводзіцца па радыё спаборніцтва на лепшую дзіцячую мастацкую самадзейнасць, прысвечаную падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. У спаборніцтве прымаюць удзел дзіцячыя калектывы дзесяці гарадоў і раёнаў БССР: Менска, Віцебска, Магілева, Оршы, Полацка, Рэчыцы, Бабруйска, Рагачова і інш.

Піянерскія атрады 25 і 18 школ Менска запрасілі на свае зборы і паказы мастацкай самадзейнасці дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР.

Лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці будуць прэміраваны.

КОМУНІСТЫ ФРОНТА МАСТАЦТВАЎ БССР ПЕРАД ВЫБАРАМІ ПАРТОРГАНАЎ

15 красавіка пачаўся справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР. Партарганізацыя Упраўлення, уся маса работнікаў мастацтваў упраўве патрабаваць справаздачы аб тым, як мы вялі барацьбу з ворагамі народа, як выхоўвалі комуністаў і беспартыйных у духу рэволюцыйнай пільнасці. Яны павінны даць ацэнку нашай работы ў справе выхавання і росту комуністаў і беспартыйных, у справе вырошчвання кадраў, узняцця дысцыпліны ў апараце Упраўлення для выканання тых задач, якія ўскладзены на кіруючыя органы мастацтва партыяй і савецкай уладай.

Трэба сказаць, што пралезшыя на асобныя ўчасткі мастацтва (тэатры, Філармонія, Кансерваторыя, арганізацыі мастакоў, работнікаў кіно) ворагі народа былі выкрыты без удзелу Упраўлення па справах мастацтваў.

Які асноўны недахоп нашай работы па ўзняццю ідэйна-палітычнага ўзроўню комуністаў? Недахоп гэты ў тым, што свой гурток па вывучэнню гісторыі партыі мы фактычна ператварылі ў гурток бягучай палітыкі, сцёршы тым самым грань паміж унутрыпартыйнай справай палітычнага выхавання комуністаў і справай агульнамасавай палітвыхаваўчай работы ў калектывах Упраўлення па справах мастацтваў і Дома народнай творчасці.

Мы неаднаразова выносілі рашэнні аб партыйнай вучобе, але аказваліся балбатунамі, а не людзьмі, якія здольны зрабіць большэвіцкія вывады з указанняў таварыша Сталіна аб значэнні ідэйна-палітычнай загартоўкі комуністаў. Фактычна сістэматычнай партвучобы, вывучэння гісторыі партыі Леніна — Сталіна ў нас не было. Працавалі, і зноў-такі бессістэмна, гурток бягучай палітыкі. Дзе прычыны такога становішча? Можна-б было спаслацца на рад аб'ектыўных прычын, але носьбіты іх — сам я, мы ўсе. І тут няма нам ніякага апраўдання.

Другі прарыў, непасрэдна звязаны з першым — работа па ўзняццю дзелавой кваліфікацыі нашых людзей. У маі 1937 года было прынята разгорнутае рашэнне па гэтаму пытанню, але не зроблена бадай нічога. Трэба, каб Упраўленне па справах мастацтваў не паскупілася і арганізавала рад лекцый па пытаннях мастацтваў для нашых работнікаў.

Як ліквідуюцца намі вынікі шкодніцтва на фронце мастацтваў? Партарганізацыя неаднаразова ставіла гэта пытанне перад Упраўленнем. Тое-сёе зроблена. Мы, напрыклад, зараз аднаўляем шкодніцка ліквідаваныя калгасна-соўгасныя тэатры. У Бабруйску тэатр ужо створан, у Слуцку — напярэдадні афармлення. Умацавана адміністрацыйнае і мастацкае кіраўніцтва ва ўсіх калгасных тэатрах. Мы выклікаем комсоргаў гэтых тэатраў, каб пазнаёміцца з арганізацыйна-палітычным становішчам іх арганізацый. Укамплектавана педагагічным персаналам Кансерваторыя, якая ўпершыню ў мінулым годзе своечасова пачала вучэбны год. Запрошаныя таварышы — Карповіч, Грынберг, Кузнец, Амітон, Клумаў і іншыя значна ўзнялі аўтарытэт Кансерваторыі. Выходзяць на дарогу калектывы нашай філармоніі; запрашэнне ансамбля песні і пляскі і аркестра нацыянальных інструментаў у Маскву, музыкальнае афармленне «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» у часе дэкады савецкага мастацтва — творчыя перамогі Філармоніі.

Дом народнай творчасці БССР правёў такія два мерапрыемствы, як Усебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці і выстаўка народнай творчасці, якія прайшлі на вялікай мастацкай вышыні (у тым ліку паказ оперы «Запарожац за Дунаем» у выкананні гуртка мастацкай самадзейнасці Горацкага сельскагаспадарчага інстытута).

Асобныя нашы тэатры да XX гадавіны Вялікага Кастрычніка, дзякуючы напружанай творчай рабоце, падрыхтавалі па два спектаклі. Гэта Белдзяржрдрамтэатр («Салавей» і «Вочная стаўка»), Віцебскі і Рускі драматычныя тэатры.

Ёсць паляпшэнне і ў справе стварэння арыгінальнага беларускага рэпертуара. Так, Белдзяржрдрамтэатр працуе зараз над «Кацярынай Жарнасек» (Беларусь у XVI стагоддзі пад ярмом польскіх магнатаў), мае спектакль «Салавей» (тое-ж самае, але ў XIX стагоддзі), спектаклі «Бацькаўшчына» (годы імперыялістычнай вайны) і «Партызаны» (годы грамадзянскай вайны ў БССР). Гэта значыць, што Белдзяржрдрамтэатр можа, — вядома, пры ўмове вялікай падрыхтоўчай работы, — паказаць у прадстаячай дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве мінулую і Савецкую Беларусь (дадаць-бы толькі п'есу аб Беларусі нашых дзён).

Оперны тэатр зараз таксама працуе над беларускім рэпертуарам. У рабоце оперы «Дрыгва», «Міхась Падгорны» і балет «Салавей».

Але ўсё гэта толькі нязначная частка таго, што зроблена і што трэба зрабіць у справе ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на фронце мастацтваў.

Агідная маруднасць у будаўніцтве Вялікага тэатра оперы і балета прымушае цэлы год бяздзейнічаць буйны мастацкі калектыў.

Патрэбна рэканструіраваць будынкі Белдзяржрдрамтэатра і Дома народнай творчасці, гледзячы гэтага даўно патрабуе. Не вырашана пытанне аб памяшканнях для Філармоніі і Дома народнай творчасці, а гэта перашкаджае іх прадукцыйнай рабоце.

Менскае, Гомельскае і Віцебскае музычныя вучылішчы не маюць інтэрнатаў, не забяспечаны вучэбнай плошчай.

Вялікую долю віны за такое становішча нясуць і партарганізацыя і кіраўніцтва Упраўлення ў асобе тав. Патапейкі, які яшчэ да прыходу да нас займаўся пытаннямі мастацтва і павінен быў больш канкрэтна дапамагчы ў вырашэнні пытанняў, звязаных з будаўніцтвам Вялікага тэатра, з базамі для Філармоніі, Дома народнай творчасці і інш.

За чатыры месяцы работы ва Упраўленні тав. Патапейка не дабіўся патрэбнага зруху ў рабоце. Аб гэтым даволі красамоўна гаворыць тая акалічнасць, што БССР займае па сваёй удзельнай вазе трэцяе месца ў Савецкім Саюзе, а па мастацтву мы плящемся ў хвасце. Большасць рэспублік паказалі ўжо сябе ў Маскве партыі і ўраду, асабіста таварышу Сталіну, а мы ўсё яшчэ вырашаем і дапрацоўваем гэта вялікае, палітычнай важнасці пытанне.

Побач з ліквідацыяй сур'ёзных прарываў у нашай унутрыпартыйнай рабоце (ідэйна-палітычнае выхаванне комуністаў, партвучоба, узняцце дзелавой кваліфікацыі, вырошчванне кадраў, работа з беспартыйнымі), нам трэба ўсю сваю далейшую работу падпарадкаваць справе большэвіцкай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на фронце мастацтваў, асаблівую ўвагу звярнуўшы на падшуканне памяшканняў для нашых тэатраў, школ, музычных устаноў (Філармонія, Дом народнай творчасці) і на падрыхтоўку да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Як на недахоп у рабоце партарганізацыі, трэба ўказаць і на работу з комсамолам. За справаздачны перыяд быў толькі адзін сумесны сход з комсамольцамі (а ў нас іх шэсць чалавек). Мы не дапамагаем комсамольскай групе ў большэвіцкім выхаванні моладзі. Мы маглі-б значна вырасці за лік комсамольцаў. Дзве заявы пададзены — ад таварышоў Фрыдмана і Гінзбурга. Фрыдман — наш комсорг, Гінзбург — член прэзідыума беларускага камітэта Саюза работнікаў мастацтваў. У нас ёсць яшчэ рад нядрэнных работнікаў, і калі-б наша партарганізацыя лепш працавала з комсамолам, наш рост быў-бы куды больш значны.

Мелі месца ў нашай партарганізацыі і элементы самастрахоўкі. Прыклад — фармальна-бюракратычны падыход да справы тав. Уханава, які атрымаў спагнанне, апэльмаваны ворагамі. Гэта выпраўлена, але не ўсё яшчэ зроблена намі для ажыццяўлення рашэння Пленума ЦК ВКП(б). Бюракратычных адносін да чалавека, да партыйца ў нас багата і патрэбна зрабіць усе неабходныя вывады з вышэй паказанага рашэння ЦК ВКП(б).

І. М. РУБІНШТЭЙН.
Парторг Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР.



НА ЗДЫМКУ: сцэна з першай дзеі оперы «Кёр-Оглы» ў пастаноўцы Азербайджанскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета імя М. Ф. Ахундава.

А. Н. ОСТРОЎСКІ

(Да 115-годдзя з дня нараджэння)

У 1849 годзе на прыватных вечарах актораў і літаратараў, таленавітым рускім акторам Провам Садоўскім была прачытана камедыя «Банкрот» маладога драматурга А. Н. Астроўскага. На гэтых вечарах п'еса атрымала правільную ацэнку. Гэтая камедыя Остроўскага тагочаснай тэатральнай і літаратурнай інтэлігенцыяй была ацэнена як выдатнейшы твор рускай драматургіі. — Любата, — гаварылі аб п'есе. — У нас нараджаецца свая тэатральная літаратура, — пісалі аб новай камедыі. П'еса была прызнана як твор, які таленавіта напісан «у мэтах выкрыцця эдзіўляючага невуцтва, самадурства, мракабесся сытых і п'яных людзей» (М. Горкі).

Аднак, не так лёгка было Остроўскаму выдаць сваю камедыю. Толькі пасля працяглых цэнзурных трэнняў яна была надрукавана ў 1850 годзе. З гэтага часу і пачалося цкаванне маладога драматурга. Кімсьці з «імяністых», «пакрыўджаных» у п'есе купцоў у Пецербург быў адпраўлен данос. Справа дайшла да цара Нікалая I, які аб п'есе напісаў наступную рэцэнзію: «Дарэмна надрукавана, іграць-жа забараніць». Папячыцелю маскоўскай вучэбнай акругі даручалася «прызваць Остроўскага і ўразуміць яго». Так на адзінаццаць год была пахавана п'еса, якая лічылася першай пасля «Недарасля», «Гора ад вума» і «Рэвізора», якая выводзіла «на свежую ваду самы разбэшчаны духам клас людзей», якая выкрывала «цёмнае царства» купецка-дваранскага, чыноўніцкага, бяспраўнага укладу жыцця ў старой Расіі.

Толькі намаганнямі тагочасных перадавых актораў, пры іх падтрыманні, Остроўскі змог прадаўжаць сваю дзейнасць як драматург. I толькі ў 1861 годзе камедыя «Банкрот» пад новай назвай «Свае людзі — палічымся» з некаторымі зменамі ў тэксце ўбачыла святло рампы, была пастаўлена ў Александрынскім і Малым тэатрах.

Адзначаны намі эпізод з пастаноўкай п'есы «Свае людзі — палічымся» характэрны для ўсёй творчасці Остроўскага. Выхадзец з чыноўніцкай сям'і, Аляксандр Нікалаевіч, жывучы на Ордынцы ў маскоўскім Замаскварэччы, добра пазнаў свет купцоў, свет, які прагнуў да лёгкай нажывы, свет, дзе не было іншае этыкі як рубанак, дзе квітнеў прынцып «не ашукаеш, не прадасі». Остроўскі бічаваў драпежніцкае накапленне капітала, стварэнне багаццяў шляхам ашукання і замаскіраванага рабунку. Таму царская цэнзура так заўзята накінулася на Остроўскага, вытраўляючы з яго твораў словы глыбокай народнай праўды, накіраванай супроць тунеядцаў. «Калумб Замаскварэчча» трапіў у апалу і з боку тэатральных чыноўнікаў, якія пагардна гаварылі, што ў тэатры запахнула аўчынным кажушком і юхтовымі ботамі.

Аднак, нягледзячы на ўсе прыдзіркі, Остроўскі ўпарта працаваў у раз узятым кірунку і стварыў рэалістычныя п'есы, цікавыя сюжэтамі, багатыя мовай, з майстэрска пабудаванымі дыялагічнымі кампазіцыямі.

Творчасць вялікага рускага драматурга-рэаліста не была і ў малой ступені ацэнена ў царскай Расіі.

У 1872 годзе споўнілася дваццаціпяцігоддзе літаратурна-драматычнай дзейнасці А. Н. Остроўскага. Было ўзнята пытанне аб выдачы яму пажыццёвай пенсіі. Указвалася на яго вялікія літаратурныя заслугі і, у прыватнасці, на цяжкае матэрыяльнае становішча. Аднак, міністр імператарскага двара ў выдачы пенсіі адмовіў. Афіцыяльна юбілей не быў адзначан. I Остроўскі ўсё часцей у прыватных пісьмах піша аб тым, што ён пакідае тэатральнае поле дзейнасці. Свайму сябру Ф. А. Бурдзіну ён пісаў: «Павер, што я буду мець значна больш павагі, якую я заслужыў і якой я варты, калі развяжуся з тэатрам. Даўшы тэатру 25 арыгінальных п'ес, я не дабіўся, каб мяне хоць крыху адрознілі ад якога-небудзь перакладчыка». Больш таго, Остроўскага не толькі не хацелі адзначаць, але зацкоўвалі тэатральныя інтрыганы, цэнзары, міністры.

Толькі Краіна Саветаў поўнасцю ацаніла вялікую каштоўнасць драматургіі Остроўскага. За трыццаць тры годы — ад першай пастаноўкі п'есы Остроўскага да дня смерці драматурга — у царскай Расіі яго п'есы ставіліся не больш 15 тысяч разоў. А цяпер толькі за адзін год і толькі на клубных сцэнах яны ставяцца каля 150 тысяч разоў у год. Прычым п'есы Остроўскага ставяцца ва ўсіх саюзных рэспубліках, на мовах многіх народнасцей нашай вялікай краіны.

Не раз п'есы Остроўскага ставіліся беларускімі тэатрамі. У гэтым годзе ў рэпертуарныя планы дзевяці тэатраў БССР уключаны пастаноўкі п'ес вялікага рускага рэалістычнага драматурга.

П'есы Остроўскага ў савецкім тэатры атрымалі новае жыццё, загучэлі па-новаму, як яркая бічуючая сатыра на купецка-дваранскае, чыноўніцкае грамадства тунеядцаў.

Творчасць Остроўскага для нас мае не толькі гістарычную каштоўнасць. Яго творчасць служыць нам як зброя ў барацьбе з перажыткамі капіталізма ў свядомасці людзей. Таму так высока цэніцца літаратурная спадчына вялікага рускага рэалістычнага драматурга ў нашай краіне.

Я. ПАЎЛОЎСКІ.

Дом соцкультуры мястэчка Цімкавічы, Капыльскага раёна, стварае добрае ўражанне. Бібліятэка, якая налічвае да 5.000 кніг і каля 700 сталых чытачоў, утульная чытальня, зала для гледачоў на 400 месц, сцэна, электрычнасць. У Доме соцкультуры багатая самадзейнасць. Але самае лепшае ўражанне пакідае калгасны хор пры Доме соцкультуры пад кіраваннем **Нікалая Антонавіча Маргаліна**.

Хор існуе ўжо каля двух год. Тав. Маргалік кіруе хорам на працягу чатырох месяцаў і пад яго кіраваннем хор дасягнуў значных поспехаў. У складзе хора—30 чал., у большасці кагаснікі і калгасніцы ва ўзросце ад 18 да 45 год.

Вельмі добра выконвае хор такія песні, як «Сталінская», «Чапаеўская», казацкая песня з оперы «Паднятая цаліна», «У путь дарожаньку дальнюю», «Ой, у лузе, лузе», «Чырвоная каліна», лірычную песню з фільма «Шукальнікі шчасця», «Што гэта за звон» і шмат іншых. У рэпертуары хора—беларускія, рускія, украінскія, грузінскія народныя песні.

Увесь Капыльскі раён ведае і любіць цімкавіцкі хор. Любяць свой гуртох і самі ўдзельнікі. Два разы ў тыдзень акуратна наведваюць яны заняткі, праводзячы культурна і карысна свой вольны ад работы час. Калгасны хор вельмі часта выступае перад працоўнымі свайго раёна і кожны раз з новымі песнямі. Вялікую работу правёў хор у часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Зараз хор мяркуе перабудаваць сваю работу і ператварыцца ў ансамбль песні і пляскі. Для гэтага ў хора ёсць усе магчымасці, за выключэннем аднаго: у цімкавіцкім Доме соцкультуры няма ні раяля, ні нават баяна, без якога вельмі цяжка праводзіць больш сур'ёзную работу, на якую гэты калектыў здольны.

Наркамасветы БССР павінен дапамагчы цімкавіцкаму Дому соцкультуры набыць для свайго хора баян і сумесна з Домам народнай творчасці БССР дапамагчы хору ў яго далейшым росце.

М. БЕЙЛІНАЎ.

СЕМІНАР САМАДЗЕЙНЫХ МАСТАКОЎ

Перад самадзейнымі мастакамі БССР стаіць вельмі адказная і ганаровая задача — прыняць актыўны ўдзел у двух усесаюзных выстаўках: сельска-гаспадарчай (у павільёне БССР будзе спецыяльны аддзел народнай творчасці) і «Ленін і Сталін у самадзейным выяўленчым мастацтве».

Каб дапамагчы самадзейным мастакам лепш падрыхтавацца да выставак, Дом народнай творчасці БССР арганізаваў пяцідзённы семінар, на які з'ехаліся 25 самадзейных мастакоў.

9 красавіка на заключным вечары, праведзеным пры ўдзеле начальніка Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Патапейка і мастакоў-прафесіяналаў, самадзейныя мастакі ў адзін голас заявілі, што семінар даў ім моцную творчую зарадку і што такія семінары трэба праводзіць сістэматычна.

Адначасова самадзейныя мастакі расказалі, што яны рыхтуюць і што думаюць рыхтаваць да ўсесаюзных выставак. Тав. **І. Я. Пушкін** (Горкі) намеціў дзве чаканныя работы па медзі. Адна з іх паказа Леніна ў Парыжы ў 1903 годзе, другая — партрэт таварыша Сталіна. Тав. **Каўшэўны** (электраманцёр Рэчыцкай запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік») вырашыў стварыць карціну «Ленін у Горках ў Саранта». Тав. **Сержантаў** (Віцебск) закончыў карціну да сельска-гаспадарчай выстаўкі на тэму «Ахова калгаснага ўраджаю». Зараз ён працуе над карцінай «Выбары ў Вярхоўны Совет у калгасе». Скульптар **Мэзо** (Смалявічы) робіць для сельска-гаспадарчай выстаўкі групу на тэму «Дружба». Апрача таго, ён намеціў яшчэ дзве тэмы—«Ленін і Сталін у народнай творчасці» і «Дружба народаў СССР».

Група малодшых камандзіраў і байцоў—удзельнікаў семінара—рыхтуе да выставак рад твораў, тэматычна звязаных з Чырвонай Арміяй. Так, малодшы камандзір тав. **Бураў** рыхтуе да сельска-гаспадарчай выстаўкі карціну — «Сустрэча байцоў Чырвонай Арміі з калгаснай моладдзю».

Выступленні ўдзельнікаў семінара лішні раз пацвердзілі, што самадзейныя мастакі БССР адносяцца да заданняў партыі і ўрада з энтузіязмам і што ўсесаюзныя выстаўкі атрымаюць ад іх рад каштоўных экспанатаў.



Дэкада азербайджанскага мастацтва ў Маскве. НА ЗДЫМКУ: заслужаны артыст АзССР Бюль-Бюль у ролі Аскера і артыстка С. Мустафаева ў ролі Гюльчохры ў музыкальнай камедыі «Аршын-мал-алан».

Год назад, 12 красавіка 1937 года памёр пісьменнік Ілья Ільф.

Нечаканай была яго смерць для ўсіх, каму знаёма бліскучая творчая дружба Ільфа і Петрова, каму знаёмы дзесяткі фельетонаў, кнігі «Дванаццаць крэслаў», «Залаты цялёнак», «Аднапавярховая Амерыка», — якія іскрацца жыццёрадасным смехам, якія дышаць высокім аптымізмам. Гэтыя кнігі заваявалі прызнанне шырокіх мас чытачоў перш за ўсё таму, што яны праніхнуты велізарнай любоўю да нашай соцыялістычнай радзімы і совецкага чалавека, праніхнуты знішчальным сарказмам, які накіраван супроць таго, што мы называем перажыткамі капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей.

Сатыра Ільфа выклікае здаровы смех, бо яна поўна жыццёсцвярджальнасці, накіравана на выкрыццё усяго таго, што перашкаджае ў справе стварэння светлага сучаснага і будучага, і дапамагае ачышчаць наша соцыялістычнае жыццё ад нечысці мінулага.

Нарадзіўся Ілья Ільф у сям'і бухгалтара. Вучыўся ў одэскім тэхнічным вучылішчы. Пазней працаваў на авіяцыйным заводзе. З 1925 года Ільф працаваў у рэдакцыі газеты «Гудок», затым наступае літаратурнае супрацоўніцтва з Петровым, якое не парывалася да самай смерці Ільфа.

Літаратурная дзейнасць Ільфа з'яўляецца прыкладам выключнай працавітасці, прыкладам сумленных адносін да пісьменніцкай працы, да літаратуры, гэтай магутнай зброі нашай большэвіцкай партыі.

ПЛЕНУМ КАМІТЭТА САЮЗА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

14 красавіка ў Менску адкрыўся другі пленум рэспубліканскага камітэта профсаюза работнікаў мастацтваў БССР. З дакладам аб плане работы Упраўлення па справах мастацтваў на 1938 год выступіў начальнік Упраўлення тав. Патапейка.

Адзначыўшы, што вынікі шкодніцтва выкрытых ворагаў народа на фронце мастацтваў ліквідуюцца нездавальняюча, тав. Патапейка паставіў перад работнікамі мастацтваў рад задач. Асноўныя з іх—падрыхтавацца як належыць да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, якая намячаецца на красавік 1939 года. Гэта падрыхтоўка павінна ісці, у першую чаргу, па лініі стварэння нашымі тэатрамі ў шчыльным яднанні з пісьменнікамі і драматургамі высокаякаснага рэпертуара шляхам арганізацыі шырокага творчага соцыялістычнага спаборніцтва.

У жніўні бягучага года ў Маскве будзе паказана самадзейнае мастацтва народаў БССР. Работнікі мастацтваў павінны прыняць самы актыўны ўдзел у выяўленні лепшых сіл мастацкай самадзейнасці.

З іншых мерапрыемстваў, намечаных Упраўленнем па справах мастацтваў на 1938 год, трэба адзначыць стварэнне яшчэ трох тэатраў: абласнога тэатра рускай драмы, калгаснага-саўгаснага тэатра і кукальнага тэатра для дзяцей; стварэнне тэатральнага вучылішча на 70 чалавек; арганізацыю яшчэ двух ансамбляў у складзе Філармоніі; стварэнне музычнай школы — дзесяцігодкі;

Гаворачы аб надыходзячых выбарах у Вярхоўны Совет БССР, тав. Патапейка заклікаў работнікаў мастацтваў прыняць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў.

У спрэчках па дакладу выступілі актор Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра тав. **Каган**, актор Тэатра музкамедыі тав. **Крылоў**, дырэктар Белдзярждрамтэатра тав. **Гайдарын**, работнік эстрады тав. **Арыерскі**, дырэктар Кансерваторыі тав. **Гантман**, жывапісец **Зайцаў**, дырэктар Яўрэйскага тэатра **Брандэбоўскі**, прадстаўнік харкаўскага абласнога камітэта профсаюза работнікаў мастацтва тав. **Хайкін** і інш.

Выступаўшыя адзначылі нездавальняючае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР рэпертуарам нашых тэатраў, падрыхтоўкай кадраў, вытворчай вучобай

Першамайскія кіножурналы

Чарговыя нумары кіно-журналаў студыі Белдзяржкіно ўключаюць рад сюжэтаў, прысвечаных падрыхтоўцы да 1 Мая. На экране будзе паказана падрыхтоўка мастацкай самадзейнасці віцебскім Домам мастацкага выхавання дзяцей, перадсвяточнае соцыялістычнае спаборніцтва на варштатабудаўнічым заводзе імя Кірава, перадсвяточны гандаль, выраб ста тысяч святочных падарункаў дзецям на кандытарскай фабрыцы «Комунарка» і інш.

28 красавіка студыя пачне здымку экстранага выпуску кіно-журнала, прысвечанага 1 Мая. Будуць зазняты парададзень свята на кватэрах стаханаўцаў, на вуліцах, потым першамайская дэманстрацыя і г. д.

Дыспут па аповесці „Хлеб"

Комсамольская арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР арганізавала на фабрыцы імя Куйбышэва дыспут па аповесці Аляксея Талстога «Хлеб». Комсамолец тав. Рудзько зрабіў на гэту тэму даклад. Ён расказаў маладым рабочым і работніцам аб выдатным творы совецкай літаратуры, які бліскуча адлюстроўвае гераічную абарону Царыцына, арганізаваную таварышом Сталіным. У дыспуце актыўны ўдзел прынялі рабочыя.

Маладая паэтэса Эдзі Агняцвет прачытала свае вершы, прысвечаныя абароне Царыцына і палкаводцу соцыялістычнай арміі таварышу Варашылаву.

Да пытання аб выкладанні літаратуры

* * *

Г. БЯРОЗКІН.

* * *

Адной з асноўных і першачарговых задач нашай літаратурнай грамадскасці з'яўляецца падрыхтоўка новых літаратурных — пісьменніцкіх, крытычных і педагагічных кадраў.

Адным з важнейшых фактараў у падрыхтоўцы кадраў педагогаў-літаратараў з'яўляюцца літаратурныя факультэты нашых спецыяльна-педагагічных навучальных устаноў. Між тым, штодзённая вучэбная практыка гэтых факультэтаў пастаўлена выключна дрэнна. Студэнты літаратурных факультэтаў, якія павінны ў будучым заняцца выхаваннем вучняў, самі атрымоўваюць з вуснаў сваіх прафесароў, дацэнтаў, выкладчыкаў, лектараў такую дзіўную мешаніну здагадак, засушаных фармуліровачак і адкрытафармалістычных установак, якая толькі ў рэзультаце крыўднага непаразумення можа называцца «усебаковым вывучэннем літаратуры». Мы не памылімся, калі скажам, што ні ў адной другой галіне нашага літаратурнага жыцця шкодная раппаўская «метадалогія», інерцыя раппаўскага падыходу да пісьменнікаў і іх твораў не аказалася настолькі жывучай і дзейснай, як у галіне падрыхтоўкі літаратурна-педагагічных кадраў.

У нашай літаратурнай крытыцы вельмі цяжка знайсці хоць-бы адзін артыкул ці рэцэнзію, якія-б так крута, безапеляцыйна, у чыста «раппаўскім стылі» «рознасілі-б» пісьменніка і яго творы, як гэта робіць выкладчык беларускай літаратуры ў Менскім педагагічным інстытуце дацэнт В. Барысенка. Калі ў нашай літаратуры аказалася канчаткова бітай найшкаднейшая формула «саюзнік ці вораг?», разам з выцякаючай з яе ўнутрылітаратурнай «мараллю» і канцылярска-кан'юнктурнымі адносінамі да пісьменніка, дык у выкладанні літаратуры гэтая «мараль» утрымалася ў сваім амаль «першапачатковым» выглядзе.

Скажам захацелася тав. Барысенку выкрэсліць са спісу жывых творцаў беларускай совецкай літаратуры імя пісьменніка Змітрака Бядулі, ён і робіць гэта свабодна і беспакарана.

Добрая педагогіка! Паслухайце, што гаворыць тав. Барысенка на сваіх лекцыях у Менскім педінстытуце: «Кастрычніцкую рэвалюцыю Бядуля сустрэў варожа і нават да апошняга часу яшчэ не даў высокамастацкага твора, дзе-б канчаткова вызваліўся ад нацыяналізма (?!)» *) Правільна, Бядуля Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў варожа. Але на якой падставе можна сцвярджаць, што і па сёнешні дзень ён не «вызваліўся ад нацыяналізма»? І гэта пасля навел аб калгаснай вёсцы, пасля аповесці «Салавей», пасля п'есы «Салавей», пасля «Набліжэння». Проста дзіўна, на што-ж тады уключан гэты злашчасны Бядуля ў сістэматычны курс беларускай літаратуры? Мабыць для «паўнаты карціны» ў якасці адмоўнага прыкладу?

З рук Барысенкі Бядуля выходзіць заплямленым, абняслаўленым, увесь у ярлычках падобнага роду: «Творчасць Бядулі ў асноўным адыгрывала адмоўную ролю», «новай старонкі ў гісторыі беларускай літаратуры Бядуля не адкрыў»; «Бядуля — эстэт»; «Бядуля — нацыянал-рамантык»; «твор «Зачараваны край» сугуба рэакцыйны. У ім шмат містыкі, **папоўшчыны»** (!); «1-я частка «Язэпа Крушынскага» **тыпова кулацкі** твор» і г. д. Пры «аналізе» кожнай самай маленькай навелы З. Бядулі той-жа заліхвацкі стылёк, тая-ж шкодная безапеляцыйнасць.

Неабгрунтаванасць і прэтэнцыёзнасць імення такой «сугуба-рэакцыйнай» ацэнкі творчасці Бядулі не падлягае ніякаму сумненню. Не станем палемізіраваць, укажам толькі на поўную неабгрунтаванасць, а часам проста анекдатычнасць тых аргументаў, якімі Барысенка падмацоўвае шкодную сваю работу «па перагляду апэнак». Так, напрыклад, тав. Барысенка кваліфікуе паэму Бядулі «Зачараваны край» як «рэакцыйны твор» з «элементамі містыкі, папоўшчыны». «Аўтар расказвае, што бог стварыў Палессе, Беларусь, беларусоў з асобнага насення». На паверку аказваецца, што гэты «рэакцыйны твор» напісан на фальклорным і этнаграфічным матэрыяле Палесся, а што датычыць «папоўшчыны, містыкі», ды інш. дзіўных рэчаў, дык яны выдуманы адным тав. Барысенкам. На самой справе, у палескіх байках «Зачараваны край» Бядуля гаворыць пра бога выключна ў іранічным стылі, з недвухсэнсоўнай насмешкай над «тварцом». «Бог — вялікі штукар на ўсе рукі», «сівую патыліцу чухаў», «на вяроўцы з нябёс апусціўся ў ваду» і г. д. Якая-ж тут «папоўшчына»?

Тав. Барысенка ўстанаўляе ў ранніх апавяданнях З. Бядулі рысы рэлігійнасці («рэлігійны экстаз»), прычым імкнецца пацвердзіць сваё «адкрыццё» цэлым радам бессэнсоўных нацяжак. Так, гаворачы аб невялікай навеле Бядулі «Малітва маленькага Габрусіка», Барысенка робіць вывад, што твор гэты рэакцыйны, «бо прапаведуе маліцца ад усяго сэрца. У ім Бядуля выкарыстаў рэакцыйны папоўскі анекдот» (!). Сюжэт гэтага апавядання Бядулі вельмі просты. Сам тав. Барысенка перадаў яго такім чынам: «Аднойчы селянін сабраўся ў царкву і ўзяў з сабой маленькага хлопчыка Габруся, якога ахапіў «рэлігійны экстаз». Не ведаючы, што трэба рабіць ў царкве, «Габрусь голасна свіснуў». Вось і ўсё... «Габруся ахапіў рэлігійны экстаз і ён... свіснуў». Каментарыі, як гаворыцца, лішнія. Свіст, як адзіная праява «рэлігійнага экстазу», — гэта ўжо сапраўды з галіны анекдота...

Між тым, «разгром» Бядулі ідзе далей: «Таксама ў творы «На каляды к сыну» Бядуля прапаведуе тэорыю самабытнасці. Беларусь увасабляецца ў выглядзе маці». Абвінавачанне вельмі цяжкое. Але чаму, скажыце мне, тав. Барысенка, я павінен верыць вам, што створаны Бядуляй рэалістычна-бытавы вобраз маці выражае рэакцыйную ідэю «самабытнасці»? На якой падставе?

Аднак, пойдзем далей: «У творчасці З. Бядулі адлюстраван (!) упадак новага буржуазнага грамадства. На гэтым этапе ён нацыянал-рамантык. Рамантызм яго рэакцыйны». Так знішчаецца адным росчыркам пяра ўся дарэвалюцыйная творчасць Бядулі, адна з яркіх старонак мастацкай творчасці народа ў яго дарэвалюцыйнай фармацыі.

Кожны, хто колькі-небудзь уважліва прачытае дарэвалюцыйныя творы Бядулі, установіць, што асноўнай думкай паэта, яго ўнутранай страсцю, яго «пафасам» з'яўляецца іменна ўсведамленне адбываючайся трагедыі, трывожнае пачуццё незадаволенасці жыццём, не зусім пэўныя, але зусім адчувальныя пошукі лепшага, радаснага, чалавечага. Барысенку да ўсяго гэтага справы няма. Барысенка «разносіць» дашчэнту Бядулю за тое, што той не вырашаў «актуальных тэм» (адзначым, што Барысенка абыходзіць маўчаннем тыя вершы ранняга Бядулі, у якіх прысутнічае непасрэдна-сфармуліраваная думка рэвалюцыйнага дэмакрата, — верш «Пан» і інш); Барысенка часткова «рэабілітаваў» Багдановіча толькі за тое, што ў яго ёсць вершы, прысвечаныя паднявольнаму жыццю сялянства; Барысенка падзяліў творчасць Купалы і Коласа (аднаго і другога) на адны і тыя-ж «тры этапы», выкарыстоўваючы ў якасці водараздзелу факт наяўнасці «тэмы актуальнай» і... тэмы «не актуальнай», «індывідуалістычнай», «любоўнай», «пейзажнай». Але-ж гэта казка пра белага бычка, а не выкладанне літаратуры!

Наконт Бядулі мы ўжо спамянулі, што адсутнасць непасрэдна выражанага палітычнага матыву (хоць і такія матывы ёсць у творах Бядулі і абыходзіць іх маўчаннем не трэба было-б) не вызначае наяўнасці «рэакцыйных», «містычных», «папоўскіх» ідэй. Каштоўнасць лепшых навел Бядулі—ў той рэалістычнай сіле, з якой пісьменнік выкрывае капіталістычную рэчаіснасць. Барысенка іх дыскрэдытуе лоўкім слоўцам аб «прымірэнні з рэчаіснасцю». Толькі ў асобных выпадках ён адзначае сярод гэтых навел некаторыя, здабыўшыя яго ласку, накшталт навелы «Малыя дрывасекі» і «Пяць лыжак заціркі», ды і то вылучаючы ў якасці акалічнасцей, якія зніжаюць іх каштоўнасць, у адным выпадку «няправільнае тлумачэнне прычын беднасці селяніна» («беднасць тлумачыцца п,янствам») (!), а ў другім выпадку, — што зусім ужо смешна, — «адмаўленне аб'ектыўнага існавання шчасця» (!) у канцоўцы апавядання «Пяць лыжак заціркі», якое наогул займае адну старонку.

Гэта аб Бядулі. Што датычыць М. Багдановіча, дык тут «установка» тав. Барысенкі сказалася ў яшчэ большай меры. У Багдановіча Барысенка вылучыў у якасці «змякчаючых віну» акалічнасцей толькі тыя творы паэта, якія прысвечаны сялянскаму жыццю. Сам па сабе факт звароту Багдановіча — паэта, выхаванага на сімвалічнай культуры (між іншым, востра адчуваўшага народную песню), да падкрэслена сацыяльнага матыву — факт, варты ўвагі, але абмяжоўвацца выключна ім пры спробе паказаць дадатнае ў паэзіі Багдановіча—значыць абмежаваць сябе з'явамі, у асноўным мала характэрнымі для пісьменніка. Каштоўнасць Багдановіча не ў тым, што ён часам аплакваў жабрацкае сялянскае жыццё (факт сам па сабе, паўтараем, сімптаматычны), а ў іншых, глыбей ляжачых з'явах і ўласцівасцях паэтычнай сістэмы Багдановіча. А шукаць гэтыя ўласцівасці трэба было іменна ў межах тых паэтычных тэм Багдановіча, якія вызначылі фармаванне яго ўнутранага лірычнага вопыту. А то атрымліваецца, што гавораць нібы не аб Багдановічу, а аб якімсьці іншым паэце. А ў тым і заключаецца непрыгоднасць «прынцыповай установкі» Барысенкі і многіх іншых выкладчыкаў літаратуры, што да разгляду літаратуры яны падыходзяць з загадзя складзенай схемай, у якую і імкнуцца ўціснуць усе шматстайныя жывыя літаратурныя з'явы, механічна адкідваючы ўсё, што не змяшчаецца ў межах гэтай худасочнай схемы.

На канкрэтным разглядзе паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа асабліва ярка выступаюць гэтыя схемы, якія замяняюць жывое вывучэнне літаратуры. Ужо ў самым традыцыйным падзяленні іх творчасці на этапы (звычайна і ў Купалы і ў Коласа адны і тыя-ж тры этапы), якое асабліва рэзка біярэцца пад абарону тав. Барысенкам, адчуваецца гэтае навязванне худасочнай схемы замест вывучэння літаратуры. Прычым, асноўнай прадумовай падобнага падзялення з'яўляецца зноў-такі хлуслівая ўстаноўка на павярхоўна-тэматычнае заданне замест «жывой страсці» паэта, яго думкі, яго «пафасу».

Барысенка піша аб розніцы паміж «першым і другім этапам» творчасці Купалы, быццам яна заключаецца ў тым, што на «другім этапе ў Купалы выступае інтымная лірыка замест сацыяльных матываў». Гэта няправільная ўстаноўка. Па-першае, таму, што і на першым этапе Купала займаўся так-званай «інтымнай лірыкай» (пытанне заключаецца ў спосабе яе вырашэння), і на «другім этапе» ў Купалы прысутнічаюць «сацыяльныя матывы». Установка гэта памылковая, па-другое, таму, што зноў-такі абмяжоўвае праблему грамадскай значымасці паэта. Вопыт, накоплены паэтам у «перыяд» работы над грамадскімі тэмамі, у вялікай меры адчуваўся і тады, калі Купала пісаў любоўныя ці, скажам, пейзажныя вершы. Пытанне тут не ў тэмах, а ў пачуцці нянавісці да буржуазна-феадальнага грамадства, у пачуцці, якое дамініруе ў дарэвалюцыйнай творчасці Купалы.

Гэта не азначае, што творчае развіццё Купалы ці Коласа працякала прасталінейна, без скачкоў, без часовых заблуджэнняў і нацыяналістычных блуканняў.

Тав. Барысенка піша аб «першым этапе» творчасці Купалы, што «мова паэта на гэтым этапе сацыяльна насычаная, завостраная», і дадае ў якасці прыкладу радок: «Свеціць месяц, свеціць, як дзірка ў сярмязе». Гэта драпная і павярхоўная ацэнка. Дапусцім на мінуту, што Купала замест гэтага «сацыяльна насычанага» параўнання (якое, дарэчы, прыводзіцца выключна ў мэтах парадыйных, у адносінах да паэтычных «канонаў») даў-бы параўнанне іншае, больш «традыцыйнае», — няўжо-б гэта мела ўплыў на агульную ацэнку верша? Ды і наогул, ці можна паняцце «сацыяльнай завостранасці» механічным шляхам пераносіць на кожны радок, на кожнае параўнанне?

Тав. Барысенка гаворыць аб кожным, нават самым маленькім лірычным вершы такім тонам, быццам перад ім трохтомная навуковая праца на тую ці іншую тэму рэчаіснасці. Скажам, «у творы (у невялікім вершы — **Г. Б.**) «Дзве сястры» Купала паказвае цяжкое жыццё сялянкі і работніцы ў мінулым, і ў плане кантрасту паказвае іх жыццё зараз». «Істотным недахопам твора з'яўляецца тое, што ўвесь ён вытрыман у плане перавагі сялянкі над работніцай, у той час, калі трэба наадварот» (!).

Аналізуючы пытанні вузка-паэтычныя, фармальныя, тав. Барысенка часам даходзіць да з'яў здзіўляюча смешных. Так, напрыклад, «разбіваючы» Бядулю, Барысенка выкарыстоўвае ў якасці аднаго з аргументаў той факт, што некаторыя раннія творы Бядулі напісаны рытмічнай прозай. Барысенку гэта рытмічная проза яўна «не задавальвае» і ён робіць глыбокадумную заўвагу: «Змітрок Бядуля ў сваіх лірычных імпрэсіях гаворыць рытмічнай прозай. Мова размерана рытмічная, блізка прымыкае да мовы верша. Гэтым аўтар хацеў супроцьставіць сваю мову жывой мове працоўных мас» (!!). Вось дык ацэнка! Калі рытмічная мова абавязкова азначае «супроцьстаўленне жывой мове працоўных мас», то што-ж тады сказаць аб вершы, г. зн. аб такой форме спецыяльнай арганізацыі мовы, у якой прынцып рытмізацыі з'яўляецца асноўным прынцыпам.

«Стихи — существеннейший вздор-с. Рассудите сами! Кто же на свете в рифму говорит? И если бы мы стали все в рифму говорить, хотя-бы даже по приказанию начальства, то много ли бы мы насказали-с? Стихи не дело...» Гэтыя словы належаць аднаму з герояў «Брацціяў Карамазавых». Як бачыце, пераклічка прамая, і наўрад ці робіць яна гонар некаторым выкладчыкам літаратуры ў нашых навучальных установах.

Рэгулярна паўтараемае з года ў год такое выкладанне робіць сваю справу — усяляе студэнтам мёртвую раўнадушнасць да мастацкай літаратуры. Відавочна, такое становішча павінна быць у самы бліжэйшы час зменена. Гэтага ў першую чаргу патрабуюць жывыя, штодзённыя інтарэсы совецкай школы.

*) Вытрымкі, прыведзеныя ў артыкуле, узяты аўтарам з запісаў лекцый г. Барысенкі студэнтамі літфака Менскага педінстытута.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». **Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.** Уп. Галоўлітбела № Г—4000